Пагарэльцы ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960 NR INDEKSU 366714

Спалучае нас традыцыя ☞ 8

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 24 (2613) Год LI | Беласток, 11 чэрвеня 2006 г. | Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

Царква ў II Рэчы Паспалітай

Фота МІРЫ ЛУКШЫ

Прэзідыум канферэнцыі (злева): епіскап Іакаў, а. д-р Георгій Тафілюк, мітрапаліт Сава

Кафедра Праваслаўнай тэалогіі Універсітэта ў Беластоку правяла чарговую навуковую канферэнцыю на тэму „Праваслаўная царква ў міжваенны перыяд". Канферэнцыя была б міжнародная, калі б прапусцілі праз мяжу прафесара Сяргея Токця з Беларусі. Падрыхтаваў ён даклад „Дзейнасць Корпуса аховы пагранічча (КОР) у адносінах да Праваслаўнай царквы". Канферэнцыя праводзілася 2 і 3 чэрвеня, дзень да свята Холмска-Падляшскіх мучанікаў.

Канферэнцыя, матэрыялы якой будуць апублікаваны ў царкоўным друку, сабрала ў зале Цэнтра праваслаўнай культуры духавенства на чале з яго блажэнствам мітрапалітам Савам, епіскапамі Іакавам і Грыгорыем, манаскую і навуковую брацію, жменьку верных слухачоў, якія заўжды прыходзяць у Цэнтр на арганізаваныя тут навуковыя і папулярныя сустрэчы. На жаль, не бачылася моладзь, а таксама і катэхеты, якія перадалі б моладзі гістарычныя веды пра мінулае, часта трагічнае, нашай Царквы. Яго блажэнства Сава адзначыў тут прысутнасць рэктаркі прыватнай Педагагічнай вышэйшай школы ў Беластоку Іаланты Альшэўскай-Бакі, якая заявіла, што ў праграме ейнай школы з'явяцца элементы гісторыі і культуры нацыянальных і канфесійных меншасцей. Паявіўся таксама прадстаўнік адміністрацыйных улад — дарадчык ваяводы, што было з прыемнасцю адзначана арганізатарамі, якія ў апошні час прыкмячаюць пэўную непавагу з боку ўлад да мерапрыемстваў арганізаваных праваслаўнымі, таксама і ў час святкавання дзяржаўных свят (*Ваявода ў царкву не пойдзе*). Выклікала гэта дыскусію, паколькі папахвала гэта якраз тым часам, які прадстаўляўся на канферэнцыі.

Канферэнцыю пачаў мітрапаліт Сава, які прадставіў дарогу да аўтакефаліі пасля I сусветнай вайны і сітуацыю Царквы ў той час разам з амаль пяццю мільёнамі праваслаўных. „Польская аўтакефальная Праваслаўная царква" ад 17.09.1925 г., прынятая ў той час усімі праваслаўнымі аўтакефальнымі цэрквамі (апрача Маскоўскай), сёння павінна хутчэй называцца „Праваслаўнай царквой у Рэчы Паспалітай". Айцец праф. Марыян Бэндза ў „Дарозе да аўтакефаліі" прадставіў юрыдычна-палітычную сітуацыю Царквы ў міжваеннай Польшчы. Хоць усе канстытуцыі забавязваліся захоўваць свабоду веравызнання і сумлення ўсіх царкоўных згуртаванняў і іх членаў, польская маладая дзяржава ўмешвалася ў царкоўнае жыццё і ўстаў, у выбар царкоўных іерархаў, падбор кандыдатаў да царкоўнай службы і нават у духоўныя школы; на візіт епіскапа ў глыбінцы мусіў быць дадзены адміністрацыяй дазвол на два тыдні да візіту. Юрыдычны стан Царквы прадставіў ад'юнкт касцельнага права доктар Павел Барэцкі. Царква не была юрыдычнай асобай. Трактавалася ў прынцыпе як варожая польскасці сіла, спадчына па расійскім панаванні. Адымалася царкоўная маёмасць, пачалі палаць і разбурацца цэрквы (сам мітрапаліт Сава вучыўся ў пачатковай школе, якую збудавалі з матэрыялаў ад разваленага праваслаўнага храма). Ватыканская інструкцыя па неаўніяцкай місійнай дзейнасці даручала весці навяртанне праваслаўных на каталіцтва (заснавана 29 парафій), затое ў праваслаўе вярнулася 67 тысяч лэмкаў. Узніклі грамадскі рух „палякаў праваслаўных", праваслаўная газета, якія выказвалі ахвоту праваслаўных да лучнасці з польскай уладай. Быў выдадзены „Малітоўнік праваслаўнага салдата". Пера-кладалася праваслаўная літургія на польскую мову (каталіцкая была па-лацінску; у той час перакладалася з лаціны м.інш. на французскую), што выклікала павышанае зацікаўленне палякаў праваслаўем, такое, што журналісты, якія раней былі антыправаслаўнымі, сталі пратэставаць супраць паланізацыі Царквы і замены стараславянскай мовы польскай). „Nie będziemy mówić nic o kwestii języka" — агаварыліся выступоўцы.

Краналіся справы „Рэвіндыкацый у дачыненні да Праваслаўнай царквы" (праф. Антон Мірановіч), „Праваслаўнага школьніцтва ў міжваенны перыяд" (рэктар Праваслаўнай семінарыі а. д-р Георгій Тафілюк), „Праваслаўнай іерархіі ў міжваенны перыяд" (а. д-р Дарафей Савіцкі), „Канстытуцыйных абумоўленняў юрыдычнага становішча ПАПЦ у II Рэчы Паспалітай" (д-р Яраслаў Матвяюк), „Манаскага жыцця ў міжваенны перыяд" (д-р Уршуля Паўлючук), а таксама „Місіянерскай і дабрачыннай дзейнасці Праваслаўнай царквы" (а. д-р Генрык Папроцкі, які праз некалькі дзён адзначаў 45-годдзе службы Госпаду).

Міра ЛУКША

Што на свеце робіцца... ☞ 2

Віктар САЗОНАЎ

Едучы на днях у гродзенскім тралейбусе, мне давялося пачуць цікавую размову. Два добра падвыпітыя мужчыны голасна разважалі на нейкія глабальныя тэмы. Разважалі так, што ўвесь тралейбус з захапленнем слухаў толькі іх. Яны ўзгадвалі вельмі цікавыя факты, прыводзілі на кожную тэму добра абгрунтаваныя доказы і рабілі даволі нечаканыя і цікавыя высновы...

Выкліканне слова ☞ 2

Ежы ПЛЮТОВІЧ

— Як і аб чым пісьменнік павінен пісаць сёння, тут і цяпер? — звярнуўся, было, да мяне малады паэт-постмадэрніст. — Гэтая хуткасць перамен у маштабе ўсяго зямнога шара, тлум падзей, усялякіх кніг, карцін, гукаў, разнародных з'яў мастацтва наводзяць на мяне ляк, замест інспіраваць. Даўней, у залаты век, людзі мастацтва адабралі адзін, адзіны дамінуючы стыль, як хоць бы рамантызм, сімвалізм, сюррэалізм ці экзістэнцыялізм...

Пілікі трымаюцца Бельска ☞ 4

Аляксандр ВЯРБІЦКІ

У Пілікі на пачатку вёскі — калі пачаткам назваць ростань вуліцы з рухлівай краёвай шашой н-р 19 з Беластока ў Люблін, а менш пафасна: з Бельска ў Сямятычы — крама, каля якой, як патрабуе цяперашні тутэйшы рытуал, прысела групка мужчын з цьмянымі бутэлькамі ў руках; ажыўленая гутарка між імі адбываецца на дзяржаўнай мове. Далей, як гэта ў майскі час, на некаторых прысядзібных участках жанчыны займаюцца добраўпарадкаваннем сваіх панадворкаў...

Міхал Кандрацюк — прафесар ☞ 9

Міра ЛУКША

— Ён адзін з нашых хлопцаў, выхадцаў з беларускай вёскі, які стаў знакамітым прафесарам, аўтарытэтам не толькі ў сваёй галіне, — сказаў праф. Ян Чыквін на ўрачыстым святкаванні юбілею 45-годдзя працы на ніве славянскага мовазнаўства прафесара Міхала Емяльянавіча Кандрацюка...

9 770546 196000

Што на свеце робіцца...

Едучы на днях у гродзенскім тралейбусе, мне давялося пачуць цікавую размову. Два добра падвыпітыя мужчыны голасна разважалі на нейкія глабальныя тэмы. Разважалі так, што ўвесь тралейбус з захапленнем слухаў толькі іх. Яны ўзгадвалі вельмі цікавыя факты, прыводзілі на кожную тэму добра абгрунтаваныя доказы і рабілі даволі нечаканыя і цікавыя высновы. Некаторыя з пасажыраў тралейбуса, каб даведацца адказ на нейкую чарговую галаваломку, нават не выходзілі на сваіх прыпынках, а ехалі далей. А тыя двое, здаецца, не заўважалі, што вакол іх ёсць людзі і хіба не асэнсоўвалі, што яны едуць у тралейбусе. Так іх захапляла спрэчка паміж сабой.

Пагаварыўшы пра мажлівасць жыцця на Марсе і неабходнасць забараніць Кітаю выпускаць няякасную прадукцыю, мужчыны, хіба што нечакана і для ўсіх прысутных і для сябе саміх, дайшлі да беларускай тэматыкі.

— А як ты лічаш, — кажа адзін, — ці доўга гэта ў нас будзе працягвацца?

— Што гэта? — перапытвае другі.

— Ну вось гэта, — не здаецца першы. — Ці доўга будзем так жыць, як жывём? Ці будуць нейкія змены?

— А, браток, не гавары, — махнуў рукой другі. — Адна радасць — не мы адны так жывём. Зараз увесь свет звар'яцеў.

І мужчыны перайшлі зноў на іншыя тэмы. А пасажыры тралейбуса, пасля згаданага дыялогу, раптам згубілі цікавасць да іх размовы. Ехалі моўчкі, думаючы пра нешта сваё. Я таксама пачаў разважаць пра сваё і злавіў сябе на думцы, што міжволі намагаюся адказаць на тыя пытанні пра наша жыццё, якія задавалі адзін другому мужчыны. А паўзіраўшыся на твары іншых пасажыраў, я зразумеў, што і яны намагаюцца знайсці адказы менавіта на тыя пытанні. Гэта пацвярджалася і тым фактам, што больш нікога не цікавілі ніякія іншыя тэмы, пра якія так натхнёна і цікава працягвалі разважаць два падвыпітыя чалавекі.

Я вельмі заінтрыгаваўся гэтай сітуацыяй. Сярод пасажыраў тралейбуса былі людзі розныя. Па знешняму выгляду было бачна, што тут і рабочыя, і выкладчыкі, і студэнты. Недалёка ад мяне задумліва стаялі два міліцыянты. Побач сядзела жанчына сярэдняга ўзросту, хіба хатняя гаспадыня. Людзі малодшыя і старэйшыя. І ўсе раптам замоўклі і задумаліся. Упэўнены, што яшчэ год назад тут пачалася б бурная спрэчка. Хтосьці сказаў бы: „А што, чым мы кепска жывём?" Нехта пачаў бы даказваць, што наша жыццё анічога не вартае, і мы ўсёй краінай і ўсім народам рухаемся прама ў бяздонне, дзе і прападзём. Знайшліся б і такія, якія голасна і на пальцах пачалі б паказваць, што мы па ўсіх параметрах адстаём ад сваіх суседзяў. Іншыя даказвалі б, што гэта суседнія краіны жывуць горш чым мы. А нехта махнуў бы рукой і, уздыхнуўшы, вымавіў бы даўно стаўшую легендарнай фразу: „Абы вайны не было". Можна ўпэўнена сцвярджаць, што людзі адрэагавалі б па-рознаму. І нават паспрачаліся б. Неаднойчы прыходзілася быць сведкам такіх спрэчак. А зараз, усе, нібыта па камандзе, замоўклі і задумаліся.

Сапраўды, такая ўсеагульная задумлівасць над гэтым пытаннем — з'ява для Беларусі новая і незвычайная. Большасць людзей нават не ведаюць, што і зараз, калі пра выбары ўжо пачалі забывацца, працягваюцца суды над апазіцыянерамі. Што Еўрасаюз і Амерыка разважаюць пра ўвядзенне эканамічных санкцый у дачыненні да Беларусі, што кіраўнікі дэмакратычных краін ахвотна і з павагай сустракаюцца з лідэрам аб'яднанай беларускай апазіцыі, а не з афіцыйнымі дзяржаўнымі прадстаўнікамі. Не ведаюць шмат чаго. Бо няма калі шукаць інфармацыю. Бо на тэлебачанні гаворацъ зусім пра іншае. Бо мітусня жыцця не пакідае на гэта часу. Але пачуўшы пытанне: „Ці доўга так будзем жыць?", задумаліся і пачалі шукаць адказ. Хіба таму, што хочацца іншага жыцця. А адказу на тое пытанне няма. Нават тыя падвыпіўшыя спрачальшчыкі, якія так доўга разважалі на кожную звышаддаленую ад нас тэму, пра беларускую сітуацыю абмежаваліся некалькімі словамі, не зрабіўшы аніякіх высноваў.

Каб праверыць правільнасць сваіх разважанняў, я звярнуўся да мужчыны, які стаяў побач. Пытаюся, што ён мяркуе наконт нашага жыцця. Той усміхнуўся, здзівіўшыся таму факту, што я адгадаў пра што ён думае, махнуў рукой і неяк няўпэўнена адказаў: „Ды зараз усюды неяк кепска стала. То тое, то сёе. Увесь свет звар'яцеў".

Вось так і жывём. На пытанне пра наша жыццё шукаем праблемаў у іншых. Як у тым анекдоце, дзе пасажыр сапсаванага самалёта, ведаючы што ён загіне, мае толькі адну радасць, што ў самалёце ён не адзін.

Віктар САЗОНАЎ

Выкліканне слова

— Як і аб чым пісьменнік павінен пісаць сёння, тут і цяпер? — звярнуўся, было, да мяне малады паэт-постмадэрніст. — Гэтая хуткасць перамен у маштабе ўсяго зямнога шара, тлум падзей, усялякіх кніг, карцін, гукаў, разнародных з'яў мастацтва наводзяць на мяне ляк, замест інспіраваць. Даўней, у залаты век, людзі мастацтва адабралі адзін, адзіны дамінуючы стыль, як хоць бы рамантызм, сімвалізм, сюррэалізм ці экзістэнцыялізм. Сённяшні постмадэрнізм выраджаецца ў какафонію, у хаос, у магму, якую і не ахапіць. Калі, здавалася б, нейкі сур'ёзны мастацкі прыём ці спосаб апавядання што і руш выяўляе свой кплівы, насмешлівы бок.

Пасля яго слоў у кавярні запанавала зларадная ціш. Прысутныя выразна чакалі таго, што скажу я; пэўна, спадзяваліся бліскучай рэплікі. Нават самотны, сур'ёзны бармен нахіліў да мяне правае вуха, а цень таго вуха захістаўся на скрыжаваных далонях журналісткі мясцовай газеты, каб прапасці як марскі вуж у кавярняным бяздонні.

Прысутныя чакалі, а я адчуў, як мне робіцца наперамен горача і зябка; усвядоміў я, што не ўмею сфармуляваць адзінага, галоўнага помыслу на творчасць, які абавязваў бы ўсіх смяротных. Я маўчаў, а на экране маёй свядомасці перасоўваліся лісты запісаныя жывым болем быцця.

Бывала, што цікавілі мяне актыўныя індывідуальнасці, ад якіх біла энергія, пераможцы накіраваныя навонкі, да свету, якія паглынаюць прасторы, а нават амаль усю часапрастору. Схільныя да таго, каб са свайго жыцця стварыць твор мастацтва: яны таксама найхутчэй, найлягчэй здабываюць папулярнасць, славу, вядомасць, таксама і ўхвалу публікі. Ды як жа часта іх славутасць прамінае разам са смерцю, якая бывае строгім, няўмольным суддзёй. Ды побач іх экзістуюць індывідуальнасці, якіх энергія накіраваная ў глыб сябе, самотныя, начныя птахі, містыкі, апантаныя, бежанцы на бездарожжах, абочынах рэальнасці; бывае, што і пры жыцці іх мала ведаюць, ды каштоўнасць іхных твораў расце з цягам часу.

— Ну, што ж, — прамармытаў я. — Пісьменнік павінен быць адкрыты на акаляючую рэчаіснасць, мусіць здабываць веды, неабходныя для канструкцыі светаў, якія стварае; мусіць вучыцца да труны; мусіць быць перапоўнены ведамі, каб мог дзяліцца імі з нашчадкамі. Мусіць кахаць кнігу...

Я змоўк, а ніхто з тых, хто сядзеў за столікам, не падняў упушчанай ніці размовы.

„Як часта, — падумаў я з сумам, — у поглядах на сябе, на жыццё, на сябе ў свеце мы небесстароннія, не ўспрымаем поглядаў асоб нам ідэйна чужых, ворагаў. Ды погляды ідэйна нам блізкія некрытычна паважаем. Філосаф Карл Попер аснаваў усю сваю навуку на тым, каб усе канструяваныя намі тэорыі, а што ж можа быць больш блізкім ад гэтых сардэчных нам тэорый, падвяргаць бязлітаснай, непахіснай крытыцы, паколькі толькі крытыцызм, абдзіранне сябе з ілюзій, з грубых слаёў фальшаванняў, прыбліжае да праўды. Сапраўды, няма для нас нічога больш нудотнага, як паўтаранне відавочнасцей, банальнасцей; нічога, што яны блізкія праўдзе. Бывае, вось, аднак, што погляды, здавалася б, непрымальныя, адштурхваючыя ад сябе, — даюць імпульс да одуму, дзейнічаюць ажыўляльна, як крынічка ў аазісе".

— Нельга апасацца вяшчаць аб праўдзе, — я працягваў сваё спыненае выказванне. — Калі адчуваю, што пішу ўсю, поўную праўду, не баюся выказваць непапулярных тэзісаў, і ў выніку ўзнікне ўдалы тэкст.

Адстаўны прафесар універсітэта ў рассеянасці выстукаў попел з піпкі ў шклянку з півам.

„Якія ж залішнія патрабаванні, накіраваныя да пісьменнікаў, — думаў я тым часам, — каб яны займаліся справамі штодзённага быцця, грамадскімі пытаннямі, палітыкай, часовай публіцыстыкай. Мастацтва, між іншым і літаратура, не павінны займацца педагогікай, навучаннем, жыццёвымі парадамі. Бо аўтэнтычнае мастацтва аздараўляе, як заўважыў быў Фрыдрых Ніцшэ. Адзіным намерам і мэтай пісьменніка з'яўляецца тое, каб узнік добры тэкст. Няшмат больш, а гэта і так — шмат".

— Трэба даверыць сабе, сваёй уяве, — адкашляну́ў я, — дэмонію, аб якім успамінаў Сакрат; дэмоніем з'яўляецца ўнутраны голас, мабыць, перададзены Богам. Калі адкрываемся на ўяву, прамаўляе праз нас час, у якім жывём.

І я адчуў, як ахоплівае мяне радасць, бо ўрэшце выказаў я ў слове тое, што мучыла мяне ад пачатку, і што ўрэшце знайшло сваю форму.

— А справа найважнейшая, каб навучыцца хадзіць сваімі ўласнымі, самастойнымі сцежкамі, пазбыцца ўсялякіх уплываў, літаратурных бажаствоў і майстроў, — закончыў я. — А гэта мае значэнне і сэнс, пакуль пісанага слова не выпхнула агрэсіўная карцінкавая цывілізацыя, якая прапануе вяртанне ў сферу карцін, у рэчаіснасць непісьменных людаў, у дзяцінства чалавецтва.

— Я ўсё ж адчуваю, як прыгнятае мяне цяжар нашай шматвяковай культурнай традыцыі. Ды што ж за яе лепшае? — з настальгіяй у голасе падагуліў малады паэт.

Ежы ПЛЮТОВІЧ

Вачыма еўрапейца

Патрэбная стратэгія

Сеймавая камісія нацыянальных меншасцей патрабуе ад міністэрстваў адукацыі і ўнутраных спраў неадкладнага распрацавання стратэгіі асветы нацыянальных меншасцей. Мела б гэта, вядома, здзяйсняцца пры ўдзеле саміх меншасных асяроддзяў. Такі быў пастулат сфармуляваны ў час аднаго з апошніх пасяджэнняў камісіі. Віцэ-дырэктар дэпартамента веравызнанняў і нацыянальных меншасцей МУСіА Данута Главацка-Мазур падкрэсліла, што яе дэпартамент, пачынаючы з 2003 года, шматразова заяўляў ахвоту сістэмнага распрацавання такіх дакументаў:

— Перш за ўсё, аднак, чакаем ініцыятывы з боку меншасцей. Да гэтага часу заявілася літоўская меншасць; іхная стратэгія ўжо распрацаваная і рэалізуецца. Стратэгія развіцця асветы нямецкай меншасці нараджаецца ў болях. Цяпер чуем, што ўкраінская меншасць мае гатовы дакумент, над якім можам пачаць працаваць.

Пры нагодзе спадарыня віцэ-дырэктар высветліла:

— МУСіА ў ніякі спосаб не хоча накідваць спосаб канструявання стратэгіі.

У пасяджэнні сеймавай камісіі, побач яе членаў і прадстаўнікоў паасобных міністэрстваў, прынялі ўдзел прадстаўнікі саміх нацыянальных і этнічных меншасцей: украінцаў, немцаў, лэмкаў, армян, яўрэяў, кашубаў... Беларускае асяроддзе, як бы паводле становішча, прадстаўляў выключна старшыня камісіі, дэпутат ад СЛД Яўген Чыквін. У меншай ступені падзяліўся ён думкамі аб канкрэтнай сітуацыі беларускай асветы, абмяжоўваўся да пытанняў. Падкрэсліў, аднак:

— Са статыстычных параўнанняў відаць, што колькасць асяродкаў навучання дзяцей славацкай і беларускай мове значна змяншаецца.

І дадаў:

— Я запрапаную, каб у кансультацыі Камісіі апынулася ўнушэнне, каб у сваіх працах вы ўзялі пад увагу ў першую чаргу патрэбы гэтых меншасцей, якія вынікаюць, як у выпадку ўкраінскай ці лэмкаўскай меншасці, хоць бы з факту іх расцярушанасці.

Наколькі ведаю, цяжар адказнасці за стварэнне палітыкі адносна стану адукацыі беларускіх дзяцей і моладзі ў Польшчы нясе перш за ўсё БГКТ. Метадыстамі беларускай мовы пры Падляшскай кураторыі асветы з'яўляюцца дагэтуль актыўныя дзяячкі Таварыства. У справаздачы, адчытанай у час апошняга з'езду БГКТ яго старшыня Ян Сычэўскі адзначыў:

— Ад пачатку свайго існавання БГКТ вялікую ўвагу адводзіла развіццю, асабліва сярод дзяцей і моладзі, навучання беларускай мовы, арганізацыі школьніцтва ў беларускім асяроддзі.

Прычына становішча беларускай адукацыі — на думку старшыні Яна Сычэўскага — перш за ўсё зводзіцца да „недэмакратычнай атмасферы" на Беласточчыне і шырэй у Польшчы, якая вынікае хоць бы са стаўлення да Беларусі і яе прэзідэнта. Ані Ян Сычэўскі, ані ніхто з БГКТ не падзяліўся гэтым і падобнымі ўражаннямі на пасяджэнні камісіі. Нікога проста не было. А гэта ж БГКТ ужо з праграмнай прадпасылкі павінна залежаць на стварэнні стратэгіі развіцця беларускай асветы. І, можа, таму іншыя асяроддзі польскіх беларусаў павінны гэты цяжар узяць на сябе. Сярод гэтага хоць бы і пытанні дапамогі ў стварэнні сістэмы ўдасканальвання настаўнікаў і метадычных дарадчыкаў ды вырашэнні праблемы, якая датычыць неабходнасці падавання бацькамі пісьмовых заяў аб жаданні навучання іхнымі дзяцьмі меншаснай мовы — беларускай. Тут успомню аб цікавай прапанове дэпутата Я. Чыквіна:

— Мы супольна з міністэрствам павінны пачаць дзеянні, якія зацікавілі б школы і можа схілілі б іх да ўвядзення ў такіх асяроддзях [польска-меншасных — М. Х.] навучання мовы меншасці для польскіх дзяцей у якасці замежнай.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Летам Пагарэльцы ажываюць. Шмат турыстаў наведвае вёску, вандруючы па пушчы пяшком або на веласіпедах. Да старэйшых вяскоўцаў прыбываюць дзеці і ўнукі з гарадоў. Аднак амаль усе яны размаўляюць на польскай мове. Хаця пасля вайны праваслаўныя жыхары састаўлялі прыблізна палову ад усяго насельніцтва Пагарэльцаў, то зараз яны складаюць меншасць....

Недастаткова корміць лес

Зараз праца пры абслугоўванні турыстаў не дае дастатковых сродкаў для ўтрымання і таму многія маладыя жыхары Пагарэльцаў выязджаюць за работай у гарады або шукаць заробку за межамі краіны. Раней для жыхароў гэтай невялікай вёскі, распаложанай на лясной паляне Белавежскай пушчы, хапала работы ў лесе. Знаходзілі там працу людзі рознай адукацыі і розных умеласцей.

Калі пушча стала больш строга ахоўвацца і абмежавалася высечка дрэў, шмат работнікаў адышло з лясной прамысловасці. Тры сем'і з Пагарэльцаў яшчэ сеюць збожжа, але лясная звярына настолькі ім назаляе, што думаюць адмовіцца ад сельскагаспадарчай прадукцыі. Некалькі маладых сямействаў паверылі ў лозунгі аб турыстычнай будучыні іх вёскі і рашыліся шукаць занятку ў агратурызме. Аднак турысты найахвотней затрымліваюцца ў моцна разрэкламаванай Белавежы, а начлегаў у навакольных вёсках шукаюць толькі летам і ў навагоднюю ноч. Маладым людзям, якія пачалі займацца агратурызмам, прыходзіцца дадаткова падзарабляць, каб пражыць у сённяшніх складаных умовах.

Жылі з лесу

— У мінулым казалі, што з пілкай і сякерай заўсёды ў лесе работа будзе. А зараз яе няма. Калі я прыйшла сюды замуж, амаль усе жыхары Пагарэльцаў працавалі ў лесе. Мужчыны высякалі лес і вывозілі драўніну, а жанчыны працавалі пры пасадцы дрэў. У вясковым гатэлі зімой жылі мужчыны, а вясной пасялялі жанчын з падгайнаўскіх вёсак, — кажа Яўгенія Валкавыцкая, якой муж таксама працаваў у лесе. — Я ў галоўным працавала на гаспадарцы, але таксама ездзіла на пасадку лесу. Зараз дровы цяжка ў нас купіць. Яны якраз найдаражэйшыя ў Белавежы, а на акраіне пушчы ўжо таннейшыя.

— Нашых людзей з дзеда-прадзеда ўтрымліваў лес. Зараз пашырылі парк, нарабілі запаведнікаў і цяжка знайсці працу ў лесе. Узніклі прыватныя суполкі, якія займаюцца высечкай лесу і на працу прымаюць толькі сезонных работнікаў. Калі яшчэ на тэрыторыі ўсёй пушчы будзе парк, адкуль нам браць дровы? У нас мала хто мае цэнтральнае ацяпленне. Найчасцей асталіся традыцыйныя кафельныя печкі, да абагравання якіх патрэбны дровы, а не вугаль, — тлумачыць Надзея Сахарчук.

Цяжка гаспадарыць побач пушчы

Гаспадаранне на лясной паляне заўсёды было складаным, бо збожжавыя культуры нішчыла лясная звярына.

— У мінулым паляна была агароджаная каля лесу, а каля палёў стаялі платы і таму менш звярыны выходзіла з лесу ў збожжа. Калі звярына прабівалася праз засекі, то разыходзілася па многіх палях. Зараз, калі толькі трое гаспадароў сее збожжа, уся звярына сыходзіцца на нашы палі, — гаворыць спадарыня Валкавыцкая. — Цяпер дзікі ядуць бульбу, зубры — траву на лугах, а алені — збожжа. У мінулым годзе звярына настолькі знішчыла наша жыта, што не было сэнсу яго малаціць. Мы толькі скасілі салому, каб можна было заараць поле. Муж зойдзе прагнаць дзікоў на адно поле, а яны перабягаюць на іншае. Два гады таму дзікі так знішчылі луг, што трэба было яго баранаваць і насейваць новую траву.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Большасць старэйшых дамоў насяляюць пенсіянеры

— У гэтым годзе лані прыйшлі зімой на мой панадворак і пад акном шукалі яблык. Можа зараз іх слабей падкормліваюць, — заўважае Надзея Сахарчук. — У мінулым годзе дзікі так зрылі маю бульбу, што мала яе асталося. Цяпер збожжа пры лесе звярына нішчыць стопрацэнтна. Дзікі і алені падыходзяць ажно пад нашы клуні. У мяне трактар яшчэ ёсць і сын арэ агарод і ўчастак пад бульбу, а збожжа ўжо не сеем.

Раней Валкавыцкія гадавалі кароў і займаліся расліннай прадукцыяй. Калі муж спадарыні Яўгеніі захварэў, прыйшлося ім прадаць карову. Зараз у Пагарэльцах ёсць толькі 2 каровы, якія могуць удосталь наесціся травы на лугах побач вёскі. Аднак трэба назіраць за імі, каб не злавілі іх лясныя драпежнікі.

— Ужо не прыстасоўвалі мы хлявоў да еўрасаюзных патрабаванняў і апошнім часам прадавалі малако прыватным пакупнікам у Белавежы. Яшчэ гадуем крыху свіней і абрабляем зямлю. Збожжавыя камбайны выклікалі нават з Махнатага і Чыжоў, але ад расліннай прадукцыі вельмі малы даход, — сумуе спадарыня Яўгенія Валкавыцкая.

Жыхары Пагарэльцаў апасаюцца нават гадаваць курэй, бо за імі з лесу прыходзяць лісы.

— Я гадавала курэй толькі на свае патрэбы, але перастала гэта рабіць, бо ліс прыходзіць і з'ядае. Нават на маіх вачах душыў курэй. Покі я дабегла з-пад ганку ў агароджу, паспеў падушыць, — кажа Надзея Сахарчук. — Большасць вяскоўцаў гэта пенсіянеры і як паўміраем, не ведаю, што будзе з зямлёй. На аблагах пачынае расці лес і прыбліжацца да сяла.

Вёска ажывае летам

Летам Пагарэльцы ажываюць. Шмат турыстаў наведвае вёску, вандруючы па пушчы пяшком або на веласіпедах. Да старэйшых вяскоўцаў прыбываюць дзеці і ўнукі з гарадоў. Аднак амаль усе яны размаўляюць на польскай мове. Хаця пасля вайны праваслаўныя жыхары састаўлялі прыблізна палову ад усяго насельніцтва Пагарэльцаў, то зараз яны складаюць меншасць. У гэтым годзе толькі 7 сямействаў адкрыта задэкларавала сваю прыналежнасць да Праваслаўнай царквы, прыносячы перад Вялікаднем для асвячэння пасху.

— З'явіліся ў нас мешаныя сем'і, праваслаўныя пачалі хадзіць у касцёл і так каталікоў стала больш. Але хаця ў нас ёсць людзі розных веравызнанняў, мы жывём згодна і дружна. Можа толькі тыя, што нядаўна купілі дамы і пасяліліся ў Пагарэльцах, трымаюцца крыху збоку вясковага жыцця, — гаворыць Надзея Сахарчук, з якой размаўляю на беларускай гаворцы. Мая субяседніца размаўляе па-свойму з праваслаўнымі суседзямі і дзяцьмі з Варшавы і Беластока.

Калі я размаўляю з жыхарамі Пагарэльцаў, работнікі працуюць пры будове драўлянага дома. Каля вуліцы стаяць грузавікі, якімі, мабыць, давозілі будаўнічыя матэрыялы.

— Гэта варшавяк будуецца ў нас, — тлумачыць Надзея Сахарчук. — Хлеў перарабіў ён на хату і там жыве. Тыя, што былі ў яго, кажуць, што прыгожыя пакоі зрабіў усярэдзіне. Побач вуліцы будуе вялікі дом, у якім хоча адчыніць галерэю, а клуню хоча перарабіць на гатэль. На 25 дамоў у нашай вёсцы няма ўжо пустуючых хатаў. Некалькі дамоў купілі жыхары Варшавы і іншых гарадоў.

Непадалёк ад маёй субяседніцы дом купіла лекарка.

— Не ведаю, што яна тут бачыць. Калі прыедзе сюды, камары крыху яе пакусаюць і вяртаецца дамоў. Адзін з варшавякаў дом збудаваў у нас. Яму падабаецца жыццё каля пушчы, але жонка не хоча прыязджаць, — гаворыць спадарыня Сахарчук.

Маладым цяжка знайсці працу

— Маладым няма работы ў наваколлі і хто дае рады, той уцякае. Адно маладое сужонства пачало ў нас займацца агратурызмам і гадуе коней. Але з турызму ў нас яшчэ цяжка выжыць. Па-за сезонам трэба таксама зарабляць на жыццё і таму гэтыя маладыя людзі вырабляюць міскі, лыжкі або іншыя прадметы з ліпавага дрэва і прадаюць, — гаворыць Надзея Сахарчук. — Адна жанчына працуе ў Белавежы ў турыстычнай фірме і наракае, што па 2-3 месяцы прыходзіцца чакаць зарплаты. Добра, што муж яе працуе за мяжой і зарабляе грошы на ўтрыманне сям'і.

Няма ў Пагарэльцах магазіна і за пакупкамі трэба ездзіць у суседнія мясцовасці або купляць у аб'язных крамах.

— Трэба сачыць, каб аўталаўка з прадуктамі не ўцякла, — заўважае спадарыня Надзея і дадае, што за большымі пакупкамі ездзіць у Гайнаўку, бо там харчаванне таннейшае і даезд на прыватных маршрутках зручнейшы.

Аляксей МАРОЗ

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Жыхары Пагарэльцаў маглі б прыстасаваць свае хаты да агратурыстычнай дзейнасці, але ці турысты належным чынам ацэняць іх намаганні?

Кава або гарбата

Часамі мяне пытаюць, ці не тужу па працы на пошце і па сустрэчах з людзьмі са свайго паштовага ўчастка. Не, не тужу, і рады я, што вызваліўся ад гэтага абавязку. Толькі цёпла ўспамінаю той час, калі лістаношы займаліся падпіскай газет, каб людзі чыталі іх як мага больш. Я тады быў у сілах звыш дваццаці гадоў у кожную пятніцу распаўсюджваць сярод чытачоў падпісаных у мяне 200-250 экземпляраў „Нівы"; гэта быў час прыемнай радасці ад любві да роднага. Але ўжо халадней успамінаю пазнейшы час, калі газеты трэба было амаль сілай прадаваць людзям, так, як і розныя тавары на пабольшанай тэрыторыі. З людзьмі я жыў добра і думаю, што ніхто мяне не павінен дрэнна ўспамінаць. Аднак людзям не так проста ўгадзіць, бо калі б я, як пісьманосец, занёс адрасату расклеены ліст (а такія лісты прыходзілі), дык чалавек у першы момант, нават калі б не сказаў, то падумаў бы, што гэта віна пісьманосца. Так бывала, але ўсе прамінула і не вернецца.

Сённяшняя пошта іншая чым калісь. На пошце ў Дубічах-Царкоўных ужо няма лістаношаў, асталася адна толькі начальніца і то невядома на як доўга. Адзін наш пісьманосец даязджае на пошту ў Кляшчэлі, бо там яго ўстанова, і абслугоўвае 24 вёскі. Другім пісьманосцам з'яўляецца маладая сямейная жанчына з Гайнаўкі і там ейная ўстанова.

Мікалай ПАНФІЛЮК

Урок гісторыі

Нядзеля, 14 мая г.г. У пасляабедні час у Бялках, насупраць сядзібы Мікалая Ігнацюка, сядзяць на лавачцы пенсіянеры. Пад'язджае сюды аўтамашына з дзеткамі, вадзіцелем якой з'яўляецца Грыша Максімюк — ураджэнец суседняй Трасцянкі. Даехалі яшчэ дзеткі раварамі — вучні Пачатковай школы і гімназіі з Трасцянкі, якія вучацца ў Нарве.

Спадар Грыша расказаў, што яны былі ўжо каля „стопкі". Гэта след правай ступні на камяні, які знаходзіцца недалёка вёскі Бялкі. Былая настаўніца Галя Тапалянская параіла спадару Грышу, каб ён звярнуўся да мяне з просьбай расказаць ім легенду пра тое месца. Я паводле кніжкі Дзядзькі Кваса „Роздумы на калёсах" ды расказаў старажылаў, якіх няма ўжо ў жывых, расказаў моладзі пра след на „камяні Божай Маці". Потым Мікалай Ігнацюк расказаў гісторыю невядомага салдата Чырвонай Арміі, які ў першыя дні нападзення гітлераўцаў на Савецкі Саюз пакончыў сваё жыццё. Магіла байца знаходзіцца ў лесе недалёка вёскі Бялкі. Спадар Грыша Максімюк паабяцаў, што яшчэ паедзе з дзеткамі ў Пяценку. Там, на вярбе ля крыніцы, аб'явілася пастушку Божая Маці. Потым ён прыедзе ў Бялкі, каб наведаць магілу яўрэйскай сям'і, якую расстралялі нямецкія шуцманы і пахавалі ў бялоцкім лесе каля вёскі Патока. Гэтай магілай цяпер ніхто не апякуецца.

Мікалай ЛУК'ЯНЮК

Пілікі трымаюцца Бельска

У Пілікі на пачатку вёскі — калі пачаткам назваць ростань вуліцы з рухлівай краёвай шашой н-р 19 з Беластока ў Люблін, а менш пафасна: з Бельска ў Сямятычы — крама, каля якой, як патрабуе цяперашні тутэйшы рытуал, прысела групка мужчын з цьмянымі бутэлькамі ў руках; ажыўленая гутарка між імі адбываецца на дзяржаўнай мове. Далей, як гэта ў майскі час, на некаторых прысядзібных участках жанчыны займаюцца добраўпарадкаваннем сваіх панадворкаў. Каб зафіксаваць іншы рух у вёсцы, трэба было б паназіраць за ёй даўжэй. Калі ў іншых вёсках цяжка застаць у хаце солтыса, бо такі гаспадар найчасцей недзе афармляе важныя справы, тут гаспадар Пілік стаіць перад сваім домам і быццам чакае нейкай падзеі або нейкага госця. Палічыўшы мову крамавых заўсёднікаў мовай цэлай вёскі і я пшэкаю з ім на дзяржаўнай. Толькі пазней, калі ён зайшоў у іншую хату, пачуў я падляшскую гаворку і сам да яе прыстасаваўся, ён засмяяўся:

— А я і здзівіўся, што „Ніва" нейкага мазура сюды прыслала.

„Ніва" майму субяседніку не чужая, яе клопаты былі яму вядомыя, бо адразу пацікавіўся ходам шумнай судовай справы. А я ўзамен пацікавіўся ў спадара Кудэрскага ягонай вёскай.

У Пілікі сёння толькі адзін гаспадар займаецца вялікатаварнай вытворчасцю, гэта сын майго суразмоўцы. У яго больш дваццаці кароў, ад якіх малако з бака забірае сямятыцкая малачарня. Калісь яна плаціла больш за бельскую, а цяпер цэны параўняліся, але гаспадару мяняць контрагента няма разліку. У Пілікі яшчэ семярых гаспадароў, у якіх па тры-пяць кароў, якія здаюць малако ў вясковы пункт прыёму. Калісь гэты пункт прыёму малака бельская малачарня закрыла, але гурт гаспадароў, якіх спачатку было адзінаццаць, той аб'ект адкупіў і ім карыстаецца; кожны тыдзень чарговы гаспадар з суполкі прымае там малако, якое забірае цыстэрна.

Адзін гаспадар займаецца свінаводствам, чатырох — вырошчваннем агародніны пад фольгай. У двух з іх

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Крыжы на рухлівай ростані дарог

шклярні, дзе вырошчваюць саджанцы, у апошніх — двайная фольга для гэтай мэты. Усе яны займаюцца вырошчваннем такіх культур, як памідоры, агуркі, струковы перац і кветкі. Пацікавіўся я і абшырнымі цяплічнымі канструкцыямі для фольгі, што за Пілікамі з боку Бельска; там халасты жыхар Бельска спачатку вырошчваў трускалкі, пасля агародніну, але некалькі гадоў таму ўсё тое кінуў. Чатырох гаспадароў у Пілікі мае сажалкі. Адзін гаспадар, што жыве за вёскай, займаецца агратурызмам; у яго можна паставіць палаткі, паездзіць на конях.

Ідучы па вёсцы я заўважыў некалькі пустых, пастаўленых калісь з размахам хат. Бо і Пілікі закранула дэмаграфічнае бежанства з вёскі ў горад, хаця, з-за блізкасці Бельска, у меншай ступені чым больш аддаленыя мясцовасці. Крыху маладых жыхароў Пілік працуе ў Бельску. У вёсцы і хутарах сто трынаццаць нумароў хат. У самой вёсцы яшчэ жыве каля чвэрці тысячы душ, галоўным чынам, аднак, старэйшых. Каля паўтары дзесятка дзяцей наведвае пачатковую школу, гімназію — бадай трое, і хіба яшчэ будзе трое малечаў.

Пасярэдзіне вёскі стаіць невялікі будынак пажарнага дэпо. У Пілікі ёсць пажарная каманда, якая ў дэпо трымае помпу. Ранейшы войт хацеў яе забраць, тлумачыўшы, што ва ўсіх вёсках ёсць водаправоды і пажарныя краны, але так асталося.

Вяскоўцы хацелі б, каб у Пілікі заязджаў гарадскі аўтобус з Бельска, але за гэта трэба было б даплачваць і пакуль людзі на працу дабіраюцца на сваім транспарце. Апрача аўтобуснага прыпынку на згаданай на пачатку шашы, у глыбінцы вёскі стаіць і сумнаватая павець другога прыпынку, на якім пазначаны два аўтобусныя курсы. Вясковая вуліца вымашчана брукам, яна з'яўляецца часткай павятовай дарогі; між вуліцай і панадворкамі нядаўна паглыбленыя сцёкавыя равы. Калі я спытаў спадара Кудэрскага, ці не варта было б пакласці на вуліцы асфальт, ён адказаў, што павет не мае на дарогі грошай. А калі я заўважыў, што ў Рудчанскай гміне, адкуль бельскі староста Снарскі, дарогі асфальтуюцца, солтыс адказаў:

— Бо там каталікі.

— А ў вас?

— Дзесь так каля паловы будзе праваслаўных, і каля паловы каталікаў.

І гэта відаць на скрыжаванні краёвай шашы з вуліцай, побач якога за карыстальнікаў дарог заступаюцца па тры крыжы абедзвюх канфесій. Каталіцкія крыжы новыя, а праваслаўныя даволі масцітыя: адзін з 1879 года, а іншы — з пачатку першай сусветнай вайны.

Аляксандр ВЯРБІЦКІ

Нашы людзі добрай волі ў Бельску

У Бельску-Падляшскім ад пяці гадоў дынамічна развіваецца Згуртаванне людзей добрай волі „Рай". За так кароткі час арганізацыя, пераадольваючы шматлікія перашкоды, дасягнула намечаных мэты і здзейсніла пастаўленыя сабе задачы.

Згуртаванне „Рай" узнікла ў кастрычніку 2000 года, кіруючы сваю дзейнасць на ценявыя бакі грамадскага жыцця, у іх ліку грамадскую адчужанасць, беспрацоўе, беднасць, што ў ходзе бяднення некаторых груп людзей набывае вялікую важнасць. Акрамя гэтага арганізацыя займаецца непрацаздольнымі старэйшымі і ў рознай ступені хворымі людзьмі.

— Пуцяводнай ідэяй дзейнасці нашага згуртавання з'яўляецца збіранне вакол нас людзей патрабуючых дапамогі, якія самі паклапоцяцца пра ўласныя справы і вырашаць свае праблемы, — кажа Мажэна Альжбета Шэшка, старшыня згуртавання.

Галоўнай сваёй мэтай згуртаванне ставіць здабыванне незаселеных памяшканняў, якімі пасля прыстасавання маглі б пакарыстацца бяздомныя, непрацаздольныя, старэйшыя людзі, патрабуючыя падтрымкі і апекі, дзе можна было б наладзіць актывізацыйныя майстэрні або культурна-асветныя асяродкі.

Меры ў гэтым напрамку ўжо прыняты і наладжана супрацоўніцтва з Бельскай гмінай, атрымліваючы ад гміннага самакіравання будынак былой школы ў Райску, які прыстасоўваецца для жыллёвых і культурна-асветных мэтаў, дзе будуць адбывацца курсы, лекцыі, канферэнцыі і г.д. Згуртаванне наладзіла супрацоўніцтва з Павятовым цэнтрам дапамогі сям'і, Гарадскім асяродкам сацыяльнай дапамогі, даходзіць да найбольш патрабуючых дапамогі і падтрымкі людзей. Асобам, якім па старасці ці нямогласці патрэбная выручка, прапануем неадкладную дапамогу. Наладжаны бясплатны пракат рэабілітацыйных прыбораў. Згуртаванне ладзіць таксама раздачу харчовых пайкоў; у мінулым годзе гэтым відам дапамогі вартасцю ў 14 тысяч злотаў пакарысталася трыццаць асоб, а трыццаць тры асобы атрымалі лякарствы агульнай вартасцю ў пяць тысяч злотаў. Была наладжана інтэграцыйная сустрэча „Вясенняе сонца для ўсіх" дзеля выхаду за рамкі адзіноцтва. Непрацаздольныя маглі прыняць удзел у праекце „Спраўнасць у Інтэрнэце". Іншую магчымасць дае праект „Спрабуй іначай" накіраваны непрацаздольным з залежнасцю ад алкаголю.

Міхал МІНЦЭВІЧ

Пераадолець гістарычныя грахі

Гутарка з насельнікам Жыровіцкага праваслаўнага манастыра, паэтам, філосафам і публіцыстам інакам Мікалаем (паэтам Зьнічам).

— Як так сталася, што паэт, музыкант і філосаф Алег Бембель (паэт Зьніч) пакінуў родны Мінск і прыехаў у Жыровіцкі манастыр?

— Малітвамі жыровіцкага старца Іераніма, на магілцы якога адбылося ўжо шмат цудатварэнняў, адбыўся цуд і ў маім жыцці. Зыход за манастырскі мур — гэта Боскае пакліканне. І кожнага Ён гукае у свой час, праз пэўны збег абставін. Кажуць: „пакуль гром не грымне, мужык не перахрысціцца" ці „як трывога — так да Бога". Пад каляндарны Новы год 1995/1996 гадоў (мне толькі споўнілася 56 гадоў), лёс мяне так прыцісну ў (стасункі з людзьмі, бліжнімі, здароўе), што я ўсё кінуў і прыехаў у Жыровічы да свайго сябра — выкладчыка семінарыі. Памаліўся на магілцы старца Іераніма: „Ойча, гіну, памажы!.." А на наступны дзень ягоны былы келейнік, наш сённяшні старац Мітрафан, сказаў мне: „Трымайся манастыра!" Пасля праз некаторы час дадаў: „Ты — літаратар. Вось табе жыціе старца Іераніма (дае „сляпы", зачытаны амаль да дзюрак машынапіс, старонак каля трыццаці), перачытай, размнож яго і прывязі мне, я буду раздаваць паломнікам". Гэта быў мой першы манастырскі послух. Праз паўгода, 8 ліпеня 1996 года, я прывёз старцу Мітрафану жменьку адксераваных жыцій старца Іераніма. Прыехаў тады на тры дні, якія расцягнуліся ўжо амаль на 10 гадоў.

— Брат Мікалай, як да Вас як манаха-паэта адносяцца іншыя браты і сёстры?

— Вельмі зычліва. Беларускія карані амаль ува ўсіх жывыя. Многія размаўляюць са мной па-беларуску. А хаця б жменьку нашых слоўцаў ледзьве не кожны прамаўляе пры сустрэчы.

— А ці хвалююць Вас мірскія праблемы?

— Найболей хвалюе злачынная праграма „Славянскія землі — без славян". Разбэшчванне нашай моладзі праз сродкі масавай інфармацыі, дыскатэкі, камп'ютэрныя клубы, школьную секс-асвету і г.д. набыло такі размах, так хітра прадумана і прафінансавана ворагамі хрысціянскіх народаў, што, па чалавечых мерках, праз адно пакаленне тут будзе амаль пустая зямля. Прыходзь і бяры яе голымі рукамі. Распуста — ад слова пуста. Толькі цуд Божы можа ўратаваць нас — як у 1941 годзе... Зразумела, калі пакаемся і будзем супрацьстаяць нашэсцю нячыстай сілы...

— Скажыце, калі ласка, а скуль Вы ўзялі псеўданім Зьніч?

— Паводле старабеларускай міфалогіі, Зьніч — дух смерці, свяшчэнны Божы агонь, які вынішчае на зямлі зло. Але ёсць яшчэ і хрышчоны Зьніч. Вось адсюль і ўзяў я свой псеўданім.

— Чым штодзённа займаецца брат Мікалай і паэт Зьніч?

— Асноўны мой послух як манаха Мікалая — гэта выданне багаслоўска-літаратурна-мастацкага лістка „Жыровіцкая абіцель", а таксама кантакты з прэсаю, са школамі, адраджэнне сядзібы Аляксандра Солтана, з якой пачаўся Жыровіцкі манастыр, іншыя справы. Даволі часта мне даводзіцца апекавацца гасцямі. Ну а рыфмар Зьніч — „рыфмарыць", калі прыходзіць натхненне.

— Брат Мікалай, у мінулым годзе Вашаму бацьку, вядомаму беларускаму скульптару Андрэю Бембелю, споўнілася б 100 гадоў з дня нараджэння. Што Вы можаце прыгадаць і ўспомніць пра яго?

— Мой бацька Андрэй нарадзіўся ў праваслаўнай патрыярхальнай сям'і. У дзяцінстве нават спяваў на клірасе. Але пасля бязбожнага кастрычніцкага перавароту 1917 года ў Расіі яго закруціла камсамольская вакханалія.

Але шляхі Божыя неспазнаныя. Пры ўсім ягоным нібыта „бязбожжы", сілуэт крыжа выразна праглядаецца амаль ува ўсіх значных бацькавых творах: „Маці-радзіма", „Курган Славы", ягоны першы варыянт Брэсцкага мемарыялу, ад якога ў натуры захаваўся толькі ўваход — рассечаная зорка. А фігура паранага воіна, які гіне, нагадвае распяцце — 18-метровы сілуэт павінен быў праглядацца на фоне рассечанай зоркі ўваходу. Гэты праект адхіліла высокая партыйная інстанцыя, яго замянілі на агульнавядомую цяпер кампазіцыю...

Паміраў бацька вельмі пакутна і часта прасіў чытаць яму мае хрысціянскія вершы. Чатырохрадкоўе, якое яму асабліва падабалася, разам з крыжыкам я ўклаў яму ў рукі у час пахавання.

— Мне здаецца, матыў абароны нашай Айчыны заўсёды дамінаваў у творчасці Андрэя Бембеля?

— Гэта сапраўды так. Возьмем яго значныя працы, такія як „Мікалай Гастэла", „Аляксандр Матросаў", скульптурная група „За Радзіму" і многія іншыя. Дарэчы, свае задумы бацька ўвасабляў не толькі ў прыродных матэрыялах, гліне ды іншых, але і ў матэрыялах духоўных — у вучнях сваіх. І мая грэшная душа, і думка, уся мая істота — у значнай ступені плён ягонай творчасці.

У час шчыравання так званага дысідэнцтва ён часта, з сумнаю ўсмешкаю, паўтараў: „Мыслящих людей у нас, к сожалению, значительно меньше, чем «инакомыслящих»". А пра дысертацыю маю (тэму якой сам параіў мне — „Нацыянальнае і інтэрнацыянальнае ў духоўнай культуры") сказаў: „Яна павінна быць напісана на беларускай мове". Ён, праўда, не чакаў, што мой радыкалізм сягне значна далей за ягоную параду, што пачну з усімі, у тым ліку і з ім самім, размаўляць па-беларуску...

— І гэты радыкалізм Вам прынёс тады нямала праблем...

— З 1971 года, калі я паступіў у аспірантуру Інстытута філасофіі і права Акадэміі навук Беларусі на спецыяльнасць гісторыя філасофіі, і да бацькавага зыходу з жыцця зямнога — я натаваў нашы амаль штодзённыя, нярэдка шматгадзінныя размовы па пытаннях гісторыі, культуры, палітыкі, педагогікі, а таксама па канкрэтных фрагментах маёй дысертацыі. Бацька з поўным правам можа лічыцца сааўтарам і маёй дысертацыі, і кнігі „Роднае слова і маральна-эстэтычны прагрэс" (Лондан 1985), складзенай на аснове дысертацыі пасля таго, як мае апаненты „адфутбольвалі" яе як „немарксісцкую і нацыяналістычную". Наша сумоўе і ў цэлым духоўны і творчы лёс бацькі — моцна паўплывалі на далейшае маё асэнсаванне нацыянальнага і інтэрнацыянальнага як багаслоўскіх катэгорый, канцэпцыю новай эры як гісторыі супрацьстаяння Хрыстовага (яго Царквы) і антыхрыставага інтэрнацыяналаў у лёсе кожнай душы, кожнага племені, чалавечага роду...

Брат Мікалай нарадзіўся ў Мінску, вучыўся на энергетычным факультэце Беларускага Політэхнічнага інстытута, у Беларускай кансерваторыі, быў аспірантам Інстытута філасофіі і права Акадэміі навук Беларусі. Выдаў некалькі кніг. З 1996 года жыве ў Жыровічах.

— А ці ёсць сёння мара ў брата Мікалая і ў паэта Зьніча?

— У мяне ёсць рыф-мары — мары ў рыфмах:

Па-за зямнымі багаццямі,
За ўзнагародай і карай,
Шэпчуцца рыфмы з паняццямі —
Там, дзе адвольныя мары...

Замест словаў паэт, паэтка — я выкарыстоўваю сінонімы: рыфмар, рыфмарка... А самая запаветная мара — пераадоленне гістарычных грахоў у кожным сэрцы і ў кожным племені.

— Брат Мікалай, напрыканцы нашай гутаркі хочацца пачуць ад Вас пажаданні, найперш маладым беларусам.

— Жадаю юнай **беларусачцы:**

Не адтуляйся ад родных палеткаў,
Абыдуцца землі чужыя без нас.
Будзь класнай настаўніцай —
сваім дзеткам,
Хай Бог табе дасць іх аж цэлы клас!

Тым, хто бярэ шлюб, які, калі ён данесены да канца, прыроўніваецца да вянца мучанікаў, жадаю:

Ёй:

Будзь ласкавай і маўклівай,
Паслухмянай і цярплівай,
Малітоўнай, працалюбнай,
І не збоч з дарогі шлюбнай.

Яму:

Не абрыдлым небаракам —
Будзь заўсёды мілым, любым,
Каб саюз ваш быў не бракам,
А сапраўдным Божым шлюбам.

Дзеткам:

Блакіт нябёс, і белы бусел,
І кветкі ў полі, як абрус.
Мой край завецца Беларуссю,
А сам я — хлопчык-беларус.
Блакіт нябёс, і белы бусел,
І кветкі ў полі, быццам хустка.
Мой край завецца Беларуссю,
А я — дзяўчынка-беларуска.

Усім:

З жуды бязвер'я і бясслаўя,
Народ, паўстаць сябе прымусь.
У таямніцы Праваслаўя
Жыве святая Беларусь!

Гутарыў Сяргей ЧЫГРЫН

Апекуны

Па дарозе з Міхалова падвезлі мяне дадому на машыне працаўнікі гміннай сацыяльнай апекі. Маюць яны пад сваімі крыламі людзей, якія чакаюць дармовых грошай з гміннай касы.

Калі б я напісаў у гміну прашэнне аб дапамогу, тады прыехалі б да мяне сацыяльныя працаўнікі, пагаварылі і ўсё было б добра. Чаму яны не пагавораць з суседзямі як жывецца прасіцелям, ці ім належыцца дапамога. Трэба ведаць каму даваць грошы.

Бывае так, што чалавек прадаў гаспадарку, грошы прагуляў і прапіў, КРУС плаціць яму пенсію, а ён абрабляе тую прададзеную зямлю, бо той, хто яе купіў, гаспадаркай не займаецца і да таго гміна беднаму пенсіянеру дае яшчэ дапамогу.

Мае суседзі, каб атрымаць пенсію, перапісалі свае гаспадаркі на сыноў і дачок, але надалей абрабляюць сваю зямлю. Калі рысць ад гэтага трайная: гаспадарка засталася ў сям'і, гаспадар атрымоўвае пенсію, а да таго Еўрасаюз даплачвае да кожнага гектара зямлі. А яны яшчэ плачуць, што няма дзе прадаць збожжа ці жывёлы!

Які дурань сядзіць у Бруселі і дае гаспадарам грошы. За што і навошта — на развіццё жывёлагадоўлі ці на павышэнне ўраджаю? Мне здаецца, што — з еўрасаюзнымі даплатамі ці без іх — і так нічога больш не вырасце.

Дзядзька ЗАХАР

Перапросіны

У мінулым годзе ў Бельскае староства паступіла дзве скаргі на медыцынскі персанал.

Першая вінавацела медсястру і кранала міжсуседскіх адносін скаржніцы з абвінавачанай. Дырэктар шпіталя Бажэна Гратовіч адказала, што працадаўца не можа ўмешвацца ў прыватныя адносіны скаржнікаў са сваімі працаўнікамі. Калі скаржнік лічыць некага вінаўным, павінен пра гэта інфармаваць следчыя органы, якія і вырашаць, ці было дапушчана парушэнне законаў.

Другая справа кранала заганных адносін лекара амбулаторыі да пацыенткі. Пасля азнаямлення са справай з лекарам была праведзена размова ў прысутнасці ардынатара і дырэктара па справах лячэння. Лекару былі прыгаданы ягоныя законныя абавязкі. Пацыентку пісьмова перапрасілі, паведаміла дырэктар Гратовіч.

Міхал МІНЦЭВІЧ

Хуліганы

У Гайнаўцы хуліганы пагнулі табліцы некаторых дарожных знакаў. Сустрэнем таксама брудныя і выбляклыя знакі. Найбольш іх на скрыжаванні вуліц Верабея і Баторыя, па вуліцах Зялёнай і Паддольнай (на апошняй з іх скрунулі знак „Стоп" на пераездзе цераз чыгуначны пуць). На скрыжаванні вуліц Верабея, Баторыя і 11 Лістапада побач тратуараў стаяць пагнутыя слупкі з ланцугамі. Там-сям ланцугі парвалі і яны або звісаюць са слупкоў, або ляжаць на зямлі. Ці дарожная служба гэтага не бачыць?

(мох)

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

Гражынка і Грак

- 27 -

— Збіраешся, Гражынка, на канікулы... — Грак расхаджваў па пісьмовым стале справа налева і ў другі бок, з крыламі назад, зусім як тата, калі ахапляюць яго роздумы і ў галаве выклёўваюцца самыя творчыя ідэі. Ды ў Грака роздумы не былі зусім творчыя: набліжалася лета, усе ў хаце меркавалі, як яго правесці, а Грак з вясны не зрабіў нічога, каб на лета мець занятак. Калі б быў пазнаёміўся з якой мілай грачышкай, дык можа і сям'ю завёў бы... А то зноў хадзі ў старых кавалерах, выглядай праз акно, як іншыя гадуюць свой вывадак! Хоць, мабыць, і не пара яшчэ было Граку засноўваць сям'ю — хоць веды меў ён немалыя, ды ўсё прасеяныя праз чалавечы досвед ды праз тэхніку. А тое, што ў птушынай душы іграла ў яго — нейкая генетычная справа: снілася яму тое, што пражыў ягоны прадзед, ведаў тое, як думалася ягонай грачысе-прабабцы... І яшчэ далей — бачылася, як выглядаюць гоні з птушынага палёту зусім невядомай тут аколіцы, парослай нізенькімі бярозкамі... Быццам быў там, хоць ведаў, што ніколі там яго не было. Ведаў, якія травы спатрэбіліся б на якую хваробу, а якіх есці нельга, бо мала што не лечаць яны, а пашкодзяць ці нават і атруцяць. Можа, ягоны мозг, праўда, маленькі, бо птушыны, гэтак забаўляўся, так як і ў нас, людзей — ствараючы свае рэальнасці ў сне ці нават і наяве, а можа і ёсць штосьці ў гэтым, што застаецца ў нас памяць пакаленняў? І перадаецца далей? Значыць, і ў Граку азывалася граковая душа — ахвота быць сапраўдным граком, спрытным, кемлівым, трывалым птахам, і быць у чорнай грамадзе, мабыць, не апошнім. І мець сяброў-пабрацімаў, хоць і не толькі ў пёры апранутых...

— Ну, як, Гражынка, бачу, што ты ўжо далёка. Не пытаешся, што ў мяне. Пра канікулы думаеш.

— Ай, прабач, Гракуша... Задумалася. Хочацца паехаць мне ў горы. У паход. Ды Кася збіраецца на мора, арганізуецца лагер у кемпінгавых домиках. Гэта для мамчыных сынкоў-пестункоў і дачушак-пястушак. Нудотна! Я была там два гады таму, думала, адурэю. А Касі не хочацца ў паход.

— Дык вазьмі мяне з сабою! — Грак аж падскочыў ад радасці. — Я не... грачок-пестунок. Памагу табе несці рукзак.

Міра ЛУКША

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Госці „Нівы"

Стаць журналістам — пра гэта мараць многія школьнікі. Нашу рэдакцыю часта наведваюць маладыя чытачы і сябры, аднак гэтая сустрэча была асаблівай. Многія дзеці ўпершыню сустрэліся з друкаванай беларускай мовай ды паслухалі фрагмент зачытанай ім казкі. Нас наведалі сябры-палякі з беластоцкай „чацвёркі". Сустрэчу прыдумала Люцына Ленарт, школьная бібліятэкарка. Нашы госці паставілі многа пытанняў, цікавілі іх тэмы артыкулаў і сам тэхнічны працэс узнікання „Нівы". Але найфайней было сустракаць у „Зорцы" сяброў са школы, пераможцаў беларускіх конкурсаў і выдатнікаў, якім адводзім многа месца.

— А ці можам і мы пісаць у „Зорку"? — дапытваліся нашы госці. На пачатак і на добрую памятку прапануем супольны здымак пад шыльдай „Нівы".

ЗОРКА

Польска-беларуская крыжаванка № 24

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку н-р 20: Мір, мяч, фон, права, дарога, дар, вандроўка, мох, том, зварот, як, мята, ара. Міт, воля, дах, фан, за, норд, норка, паўтор, кот, мадам, ява, яр, гарачка.

Узнагароды, запісныя кніжкі, выйгралі: **Сара Галубоўская, Юстына Тамберг, Кася Зданоўская, Раксана Раманчук** з Нараўкі, **Аня Анікіюк, Паўліна Башун, Наталля Янцэвіч** з Чыжоў, **Клаўдзія Садкоўская, Моніка Кухарэвіч** з Бабік. Віншуем!



Сёння ў нашай школе свята!

— Добры дзень! Добры дзень! — вітаюць нас у дзвярах дзеткі па-беларуску. Разам з настаўніцай Тацянай Андрацкай дабіраемся з Саколкі. У Бабіках сёння (31 мая) свята — ужо трэці год запар адзначаюць тут „Дзень сям'і". Таму ў школе не толькі вучні і настаўнікі, прыехалі важныя госці: мясцовыя ўлады, пагранічнікі, леснікі, пан дзельніцовы з Шудзялава. Ёсць моладзь з Апякунча-выхаваўчага асяродка для інвалідаў з Саколкі. Пані дырэктар Гражына Куклік вельмі рада апошнім госцікам:

— У нармальнай сямейцы ўсе важныя, — кажа.

Прыехалі школьнікі з настаўнікамі з гміннага Шудзялава. Знаёмства спатрэбіцца бабіцкім вучням, бо пасля заканчэння Пачатковай школы пойдуць у Гімназію, менавіта ў Шудзялава. Прыехалі таксама бацькі. Праўда, многія мамы замест глядзець прэзентацыі сваіх сонейкаў, яшчэ завіхаюцца на кухні. Пасля запросяць усіх гасцей на шыкоўны пачастунак.

„Свята сям'і" пачынаецца з мастацкіх выступленняў. На сцэну выходзяць наймалодшыя. Вершыкі і песні пра бацькоў, вясну і звяркоў цешаць і смешаць. А як жыва ўспрымаюць у зале вершы на беларускай мове!

— Нашы дзеці ездзілі на беларускі конкурс у Нараўку, — хваліць сваіх навучэнцаў пані дырэктар, — і вярнуліся з кучай узнагарод!

Сапраўды, у гэтым годзе аж адзінаццаць дэкламатараў ездзіла ў Беласток, а пасля многія паехалі на цэнтральны агляд.

Свойскі „Дзень сям'і" меў таксама еўрасаюзныя прызнакі, мастацкая праграма была падрыхтаваная па-польску, па-беларуску, па-англійску, па-нямецку і па-руску. Усе гэтыя мовы вывучаюць у Бабіках. Не дзівота — у школу ходзяць нашчадкі шарачковай шляхты. Мясцовасць такую як Шчасновічы далей у народзе называюць „аколіцай".

* * *

Свята адбываецца ў спартыўнай зале. На сценах красуецца цудоўная галерэя партрэтаў. На іх мамы і таты, усе з усмешкай, у цёплых, сонечных колерах. Над сцэнай лунае сіняе неба, смяецца сонейка і квітнеюць дрэвы. Праз момант будуць пастаноўкі. Старэйшыя вучні падрыхтавалі „Лілею" Адама Міцкевіча, які тут патронам школы (*Zbrodnia to niesłychana, pani zabiła pana...*). Дарэк Бароўскі ў чорным цыліндры больш як апавядальнік напамінае мажнога графа! Сярод акцёраў — знаёмыя; большасць з іх ходзіць на беларускую мову. І гэта толькі пачатак. Навучэнцы, пад кірункам пані Тацяны, падрыхтавалі спецыяльную праграму на беларускай мове. Вершы з дэкламатарскага конкурсу, песні і вясновую пастаноўку „Сакавік" паводле Клаўдзіі Каліны (друкавалася ў „Зорцы"). П'еса пра гуканне вясны, таму не можа адбыцца тут без песень і танцаў. Паўліна Варановіч, традыцыйна ўжо праявілася як рэперка — зараз пад рэп „узяла" народную вяснянку і сапраўды разбудзіла публіку. Спектакль завяршыўся карагодам і бурнымі воплескамі. А пасля пайшлі віншаванні і падзяка сябрам школы. Прыемна адзначыць, што сярод узнагароджаных былі асобы з беларускага асяроддзя: Вадзім Палякоў — консул РБ, які дапамагаў ладзіць экскурсію ў Беларусь, старшыня ГП БГКТ — Ян Сычэўскі і рэдакцыя „Нівы"! Свята сям'і доўжылася яшчэ да вечара. Дзеткі прымалі ўдзел у латарэі і спартыўных спаборніцтвах, а дарослыя сустрэліся з псіхолагам, каб пагутарыць пра выхаваўчыя справы ды пра жыццё і будучыню школы. Самай значнай падзеяй будзе чарговая экскурсія ў Беларусь. У гэты раз навучэнцы беларускай мовы паедуць у Ваўкавыск і Слонім.

ЗОРКА
Фота Ганны КАНДРАЦЮК

СПАЛУЧАЕ НАС ТРАДЫЦЫЯ

Вучні добра справіліся з называннем даўніх прыладаў працы (на першым плане вучні з Сярэдняй школы ў Слабудцы і настаўніца Вера Флёрчук)

Адным з завяршальных моментаў праекта „Раздзяліла нас мяжа, няхай спалучыць нас традыцыя" быў турнір наладжаны 27 мая ў Комплексе школ у Дубічах-Царкоўных, у якім прынялі ўдзел вучні са школ у Чыжах, Дубічах, Шанях і Слабудцы (абедзве апошнія мясцовасці распаложаны ў Беларусі, непадалёк Пружан). Моладзь удала гуляла, паказваючы старыя абрады і прымаючы ўдзел у спаборніцтвах, якія абапіраліся на мясцовыя традыцыі.

Мерапрыемства, якое праходзіла ў новай і прыгожай спартыўнай зале, адкрылі дырэктары Міраслаў Пяткевіч з Комплексу школ у Чыжах і Уладзімір Антасюк з Комплексу школ у Дубічах-Царкоўных.

— Арганізуючы праект разам з Дубіцкай школай мы хацелі паказаць моладзі нашы традыцыі. Уключылі мы ў наша мерапрыемства, фінансаванае з еўрасаюзных сродкаў, дзве школы з Беларусі, распаложаныя непадалёк мяжы. Хаця раздзяліла нас граніца, то спалучае традыцыя і мы адзін народ, — сказаў Міраслаў Пяткевіч, дырэктар Чыжоўскай школы, якая была ініцыятарам і галоўным арганізатарам праекта.

Рэалізацыя мерапрыемства распачалася яшчэ ў чэрвені 2005 года, калі ў Беларусі была наладжана канферэнцыя для настаўнікаў з Гайнаўшчыны і Пружанскага раёна, якія мелі прымаць удзел у праекце. Зачытваліся там даклады наконт методыкі рэгіянальнага навучання і абмяркоўваліся пытанні па рэалізацыі чарговых сустрэч.

— Восенню мінулага года наша моладзь ездзіла з настаўнікамі ў Беларусь, а вучні з Беларусі прыязджалі да нас. Маладыя людзі знаёміліся і выступалі з мастацкімі часткамі. У школах, удзельніцах праекта, праведзена было па дзесяць урокаў аб мясцовых традыцыях, а пазней моладзь хадзіла па сваіх мясцовасцях і запісвала абрады звязаныя з порамі года і рэлігійнымі святамі, — паінфармаваў дырэктар Міраслаў Пяткевіч. — Плануем апублікаваць абрадны каляндар і матэрыялы з вопісам рэалізацыі праекта. Можа выступім яшчэ за еўрасаюзнымі сродкамі на іншы праект, каб у будучыні таксама сустракацца з настаўнікамі і вучнямі з Беларусі.

— Рэалізацыя мерапрыемства вельмі карысная для моладзі, але важны таксама вопыт, які здабываюць настаўнікі. Дыдактычныя матэрыялы і абрадавыя публікацыі можна будзе выкарыстаць у час урокаў. Ёсць таксама магчымасць абмяняцца вопытам з настаўнікамі з Беларусі, — заявіў Уладзімір Антасюк.

Турнір распачаўся з прэзентацыі паасобных школ, а пасля дзяўчаты змагаліся за званне самай лепшай гаспадыні. Усе вучаніцы добра справіліся з абіраннем бульбы.

— З нашымі сябрамі размаўляем мы на беларускай літаратурнай мове, па-свойму і няма праблемаў, каб дагаварыцца. Прадаўжаем знаёмствы, якія завязаліся ў час нашых ранейшых сустрэч. Мы ўжо высылалі да дзяўчат і хлопцаў з Беларусі пісьмы і эсэмэскі, — сказала Эмілія Місяюк з Курашава.

— Мы размаўлялі з сябрамі з Беларусі пра зацікаўленні, школу і штодзённае жыццё, — гаварылі хлопцы са школы ў Дубічах-Царкоўных. Мае суразмоўцы звяртаюць увагу на радасную атмасферу і цікавыя гульні.

Доўга зацягнулася прэзентацыя абрадавых сцэнак, якія дэталёва адлюстроўвалі сваты, вяселле і хрэсьбіны з даўняга мінулага (за выключэннем вучняў Дубіцкай школы, якія паказалі больш сучасную сцэнку ў часткова гумарыстычным настроі). Відаць было, што моладзь добра вывучыла мясцовыя звычаі. Многія вучні ўдала паказалі свае мастацкія здольнасці, а іх дыялогі перапляталіся з прымаўкамі і прыказкамі. Публіцы спадабаліся таксама народныя танцы. Калі б яшчэ сярод гледачоў была шырэйшая вучнёўская публіка, магла б яна многа даведацца аб мясцовых абрадах і даўніх занятках.

Пераможцамі турніру сталі вучні Комплексу школ у Чыжах (паказваюць абрад „Хрысціны")

— Мы думалі, што вучні з Польшчы іншыя ад нас, але ў час супольных размоў высветлілася, што іх хвалююць тыя ж самыя праблемы, што і нас і таму мы хутка пасябравалі, — заявіла Аліна Ярмашэвіч з Шанёўскай сярэдняй школы.

— Відаць, што нашы абрады розняцца толькі ў дэталёвых справах ад абрадаў з-за мяжы. Тут жа падобныя дыялогі, прыказкі і прымаўкі. Я маю надзею, што мы абмяняемся сцэнарыямі абрадаў з настаўнікамі з Польшчы, — сказала Ала Сомава, настаўніца беларускай мовы Сярэдняй школы ў Слабудцы, якая займалася падрыхтоўкай цікавай сцэнкі „Сваты". Паінфармавала яна, што іх вучні збіралі экспанаты і зрабілі ў школе міні-музей. Моладзь са Слабудкі з каляндарнымі абрадамі выступае таксама ў суседніх школах.

Цяжка было вучням набраць лоўкасці ў катанні абруча з дапамогай драўлянай палкі або дроту. У гэтай канкурэнцыі вучні з Чыжоўскай школы моцна апярэдзілі сваіх сапернікаў і ў цэлым здабылі над імі балавую перавагу. Самымі хуткімі аказаліся таксама дзяўчаты з Комплексу школ у Чыжах у час размотвання мотка. Затое найлепшымі мастакамі аказаліся вучаніцы з Беларусі, якія па-майстэрску выканалі народныя выцінанкі.

— Усе мы беларусы і таму хацелі дакладней пазнаёміцца з традыцыямі на Беларусі. Для многіх нашых хлопцаў і дзяўчат у час рэалізацыі праекта ўпершыню паявілася магчымасць выезду ў суседнюю дзяржаву, — сказала настаўніца Чыжоўскай гімназіі Вера Флёрчук, якая разам з настаўніцай з Дубіч Галінай Трашчотка вяла мерапрыемства.

— Традыцыі трэба захоўваць, бо яны былі з намі ад вякоў і сведчаць аб нашай культуры, — заявіла Таня Радзівончык з Шанёўскай школы. — У нашай школе ёсць свой этнаграфічны музейчык, у якім мы збіраем экспанаты. Заязджаюць у яго госці з Беларусі, былі ў нас людзі з Польшчы.

Не было ніякіх памылак у выбары даўніх прыладаў працы, патрэбных для вырабу пражы, палатна, масла, хлеба, і іх названні і таму ў гэтай канкурэнцыі не было ні перамог, ні пройгрышаў.

— Падабаюцца нам гульні і мы цешымся новаму сяброўству. Я мару, каб у будучыні мы маглі яшчэ наведаць школы ў Польшчы, — гаварыла Вікторыя Загарулька са школы ў Слабудцы.

Вучні з Дубіцкай і Шанёўскай школ аказаліся найбольш зручнымі падчас збівання бярозавых пален. Самымі лепшымі майстрамі хады на хадулях аказаліся таксама вучні з Дубіцкай школы, якія апярэдзілі хлопцаў з Чыжоўскай школы. У канчатковым падліку першае месца занялі вучні з Комплексу школ у Чыжах, а два раўнапраўныя другія месцы заняла моладзь са школ у Шанях і Дубічах. На трэцім месцы апынуліся вучні Сярэдняй школы ў Слабудцы, якія мала ўступілі іншым камандам. Усе ўдзельнікі турніру атрымалі ўзнагароды. Падарункі атрымалі таксама пераможцы мастацкага конкурсу, якія раней малявалі і рысавалі краявіды Гайнаўскай і Пружанскай зямель. Прысутны сярод запрошаных гасцей войт Чыжоўскай гміны Юрый Васілюк пахваліў арганізатараў праекта за працу ў карысць мясцовых традыцый і абрадаў. Пасля абеду вучні супольна гулялі, а на наступны дзень наведалі Белавежу і пушчу.

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

Вучні Шанёўскай школы заахвочвалі сваю сяброўку, каб хутчэй чысціла бульбу

Міхал Кандрацюк — прафесар

— Ён адзін з нашых хлопцаў, выхадцаў з беларускай вёскі, які стаў знакамітым прафесарам, аўтарытэтам не толькі ў сваёй галіне, — сказаў праф. Ян Чыквін на ўрачыстым святкаванні юбілею 45-годдзя працы на ніве славянскага мовазнаўства прафесара Міхала Емяльянавіча Кандрацюка. — Усе здольнасці аддаў Радзіме, навуцы, славістыцы гэты сціплы чалавек, з якога лунае цяпло з нашых бакоў, — дадаў рэктар праф. Ежы Нікітаровіч. — Чалавек пагранічча культур, папярэднік беластоцкай анамастыкі, заснавальнік Кафедры беларускай філалогіі.

Міхал Кандрацюк, выдатны мовазнаўца, адзін з заснавальнікаў Польскай асацыяцыі беларусістаў, нарадзіўся 6 сакавіка 1934 года ў вёсцы Дубіны на Гайнаўшчыне. Пасля заканчэння Педагагічнага ліцэя ў Беластоку паступіў на Філалагічны факультэт Варшаўскага універсітэта. Закончыў рускую філалогію і быў адным з першых выпускнікоў беларускай філалогіі ў Польшчы. Яшчэ як студэнт, пасля як асістэнт у Інстытуце славяназнаўства Польскай акадэміі навук абышоў уздоўж і ўпоперак усё Падляшша ў складзе шматлікіх дыялекталагічных экспедыцый. Той першы вопыт дыялектолага і анамаста стаў падставай усёй далейшай кар'еры Міхала Кандрацюка. На апрацоўку *Атласа ўсходнеславянскіх гаворак Беласточчыны* прысвяціў больш за дзесяць гадоў — на збіранне дыялекталагічных матэрыялаў, апрацоўванне карт і каментарыяў да іх, падрыхтоўку агульнай даследчыцкай канцэпцыі да гэтага шматтомнага збору, які мае асноўнае значэнне для беларускай, украінскай і польскай дыялекталогіі. У час працы ў Інстытуце славяназнаўства быў таксама членам калектыву, які рыхтаваў пад кірункам праф. Антаніны Абрэмбскай-Яблонскай выданне неапублікаваных фалькларыстычных матэрыялаў Міхала Фэдароўскага *Lud białoruski*. У 1961-1970 гг. па даручэнню Камісіі ўдакладнення назваў мясцовасцей пры Радзе Міністраў вёў у глыбінцы рэгістрацыю назваў мясцовасцей і фізіяграфічных аб'ектаў у тагачасным Беластоцкім ваяводстве. Матэрыял стаў падставай падрыхтаванай у Кафедры беларускай філалогіі ВУ *Słownika nazw terenowych północno-wschodniej Polski*. На падставе працы *Nazwy miejscowe południowo-wschodniej Białostocczyzny*, у якой сабраны вопыт анамастычных і дыялектычных ведаў, Міхал Кандрацюк атрымаў званне доктара гуманітарных навук у галіне славянскага мовазнаўства. Займаючыся навукова-даследчыцкай працай супрацоўнічаў з Інстытутам удасканальвання настаўнікаў пры Міністэрстве асветы і выхавання, прымаў удзел у апрацоўванні адукацыйных планаў і праграм, вёў заняткі на курсах і студыях для настаўнікаў. У 1984 г. на падставе габілітацыйнай дысертацыі *Elementy bałtyckie w toponimii i mikrotoponimii regionu białostockiego* і ацэнкі даследчыцкіх здабыткаў атрымаў навуковую ступень габілітаванага доктара гуманітарных навук у галіне славянскага і балцкага мовазнаўстваў.

Фота МІРЫ ЛУКШЫ

Праф. Міхал Кандрацюк (першы справа) з супрацоўнікамі з філалогіі ў Беластоку — Янам Чыквіным (першы злева) і Васілём Сегенем

У 1985 г. Міхал Кандрацюк стаў кіраўніком Лабараторыі беларускай мовы Інстытута славяназнаўства ПАН. Быў ён на чале навуковых калектываў, якія рэалізавалі важныя даследчыцкія мерапрыемствы, м.інш. *Atlas gwar wschodniosłowiańskich Białostocczyzny*. Быў членам Камітэта славяназнаўства ПАН, яго навуковым сакратаром. На пачатку 1990 г. увайшоў у склад ініцыятыўнай групы, якой мэтай было заснаванне Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў.

Незалежна ад навуковых і арганізацыйных абавязкаў, Міхал Кандрацюк пачаў працу на Філіяле Варшаўскага універсітэта ў Беластоку, які з часам быў ператвораны ва Універсітэт у Беластоку. Ад таго моманту пачаў старацца сарганізаваць на Гуманітарным факультэце беларускую філалогію. Спачатку беларусістыка была дадатковай спецыяльнасцю на русістыцы, пасля стала самастойнай. М. Кандрацюк шмат гадоў быў кіраўніком Кафедры беларускай філалогіі Інстытута славянскай філалогіі Універсітэта. На пачатку 90-х гадоў быў у саставе Калектыву па справах арганізацыі і стварэння ў Беластоку навукова-даследчыцкай установы — Інстытута беларускай культуры, удзельнічаў у распрацоўцы яго структуры, мэт і даследчыцкіх заданняў. Вёў лекцыі, канверсаторыі і магістэрскія семінары на русістыцы і беларусістыцы ў галіне ўсходнеславянскага і балта-славянскага мовазнаўства. Быў прамотарам двух доктараў гуманітарных навук і больш за 120 магістраў. Найважнейшая частка навуковых доследаў М. Кандрацюка — анамастыка: мясцовыя назвы і прозвішчы (антрапанімія). Апрацаваў *Слоўнік сучасных прозвішчаў жыхароў беластоцкага рэгіёна* — сабрана да гэтага часу абшырная — у 13 тыс. назваў — картатэка прымае пад увагу частотнасць, дакладную геаграфію, дыялектныя формы і паходжанне паасобных антрапонімаў. Агулам праф. М. Кандрацюк выдаў больш за 150 навуковых праектаў і 7 важных кніг фундаментальнага значэння для мовазнаўства Польшчы, Беларусі, Украіны і Літвы. Высока цэніцца таксама ягоная арганізацыйна-эдытарская ды рэдактарская праца, м.інш. пры польска-беларускіх навуковых канферэнцыях „Шлях да ўзаемнасці". Міхал Кандрацюк таксама быў вылучаны як незалежны прадстаўнік беларускага асяроддзя ў выбарах у Сенат у 1997 г., здабыўшы галасы 27 тысяч выбаршчыкаў.

Міра ЛУКША

Пленум ГП БГКТ

21 мая ў Беластоку пад старшынствам Яна Сычэўскага адбылося першае пасляз'ездаўскае пленарнае пасяджэнне Галоўнага праўлення БГКТ. Першым пунктам парадку дня была справаздача з выканання бюджэту БГКТ за 2005 год, якую прадставіла бухгалтар Марыя Паўлючук. ГП на працягу мінулага года пры дапамозе мясцовых павятовых і гмінных самаўрадаў і некаторых установаў і спонсараў сарганізавала больш за 70 культурна-асветных мерапрыемстваў. Міністэрства ўнутраных спраў і адміністрацыі, якому падлягае цяпер БГКТ, у 2005 годзе падтрымала фінансава толькі 16 мерапрыемстваў. Астатнія праекты адбыліся дзякуючы вялікай арганізатарскай умеласці і ашчаднаму выкарыстоўванні фінансавых сродкаў. Зачытаную бюджэтную справаздачу члены ГП БГКТ прынялі аднагалосна.

Другі пункт парадку дня — „Ацэнка галоўных падзей Таварыства" — датычыў у асноўным апошніх важных форумаў, якімі былі чарговы XV З'езд БГКТ і ўрачысты пленум ГП БГКТ, прысвечаны 50-й гадавіне дзейнасці нашай беларускай арганізацыі.

У XV З'ездзе ўдзельнічала 84% выбраных дэлегатаў з усіх аддзелаў БГКТ, апрача Бельскага. Частка дэлегатаў Бельскага аддзела БГКТ на чале са старшынёй Васілём Ляшчынскім (дырэктарам Беларускай гімназіі) і яго намеснікам Андрэем Сцепанюком (дырэктарам Беларускага ліцэя) не прыбылі на з'езд, збайкатавалі яго. З гэтага вынікае, што справамі БГКТ, якімі займаўся найвышэйшы орган БГКТ, праўленне Бельскага аддзела зусім не цікавіцца і таму на з'езд прыехала невялікая група дэлегатаў. Але ў сябе ў Бельску на перадз'ездаўскай справаздачна-выбарчай канферэнцыі яны праявілі максімум намаганняў, каб быць выбранымі на асноўныя функцыі праўлення аддзела, каб пазней была магчымасць прадстаўляць беларускую арганізацыю ў набліжаючайся выбарчай кампаніі ў мясцовыя самаўрады. Відавочна, толькі для гэтага патрэбнае ім БГКТ. Байкот з'езда БГКТ праўленнем згаданага аддзела не меў аніякага ўплыву на ход XV З'езда. Прайшоў ён на высокім арганізацыйным узроўні. Закрануты былі найважнейшыя справы БГКТ, у тым ліку і справы звязаныя з Беларускім музеем і асяродкам беларускай культуры ў Гайнаўцы. У апошні час суд прызнаў, што законным уласнікам яго з'яўляецца ГП БГКТ. На з'ездзе гэтую пастанову суда аспрэчваў Міхась Голуб з Гайнаўкі.

З'езд прыняў папраўкі ў статут, вынес пастановы і выбраў новае Галоўнае праўленне на чале з Янам Сычэўскім. У ГП з 35 чалавек выбрана 15 новых членаў. А ў прэзідыуме ГП БГКТ з 13 чалавек апынулася 7 новых асоб.

Урачысты, юбілейны пленум, прысвечаны 50-ай гадавіне дзейнасці БГКТ, адбыўся ў памяшканні Ваяводскай управы ў Беластоку, што па вуліцы Міцкевіча. Як вынікала са слоў старшыні ГП БГКТ Яна Сычэўскага, новы ваявода Ян Дабжынскі намагаўся ануляваць дазвол папярэдняга ваяводы Марка Стшалінскага на скарыстанне БГКТ абшырнай залы Ваяводскай управы, быццам таму, каб не падумалі, што ён спрыяе Беларускаму таварыству. З гэтай прычыны Ваяводскай управай спецыяльна не заўважаліся вялікія дасягненні БГКТ на ніве нацыянальнай беларускай культуры, асветы і мастацкай самадзейнасці за паўвекавы перыяд дзейнасці. Кіраўніцтва гэтай установы не паслала на згаданы пленум ніводнага прадстаўніка, нават найніжэйшага рангам чыноўніка.

Ніхто таксама не з'явіўся на ўрачысты юбілейны пленум з улад горада Беластока. З абурэннем і пачуццём крыўды і нацыянальнай знявагі выказваліся ў гэтай справе многія дэлегаты. Так яшчэ ніколі не было, — гаварылі яны. Юбілейныя гадавіны БГКТ, пачынаючы з дзесяцігоддзя дзейнасці БГКТ і канчаючы на саракавой гадавіне, мясцовымі ўладамі ўшаноўваліся належным чынам.

І як не дзіўна, што не ад сваіх айчынных польскіх дзяржаўных улад адчулі мы пашану, а ад улад Рэспублікі Беларусь і беларускай прэсы (асабліва ад „Голасу Радзімы"). Яны дацанілі бэгэкатоўскіх дзеячаў і належна ўшанавалі дзейнасць БГКТ.

На юбілейны пленум прыехала значная ўрадавая дэлегацыя з Беларусі і некалькі журналістаў. Прыбылі таксама прадстаўнікі абласных улад з Гродна, прадстаўнікі Пасольства РБ на чале з надзвычайным і паўнамоцным паслом Паўлам Латушкам і прадстаўнікі Генеральнага консульства РБ у Беластоку на чале з Леанідам Каравайкам. Прадстаўнікі РБ выказалі шчырую падзяку дзеячам БГКТ за значныя дасягненні на ніве культурна-асветнай дзейнасці, на ніве беларускасці. Яны ўручылі многім дзеячам БГКТ памятныя дыпломы і ганаровыя граматы. Дыпломы былі і ад ГП БГКТ.

Майскі пленум прыняў запрапанаваны сакратаром ГП БГКТ Валянцінай Ласкевіч план культурна-асветных мерапрыемстваў на 2006 год, а таксама стварыў дзве праблемныя камісіі — культуры і асветы.

Пленум прыняў таксама пастанову ў справе самаўрадавых выбараў. Вырашана, што БГКТ далей удзельнічаць будзе ў кааліцыйным камітэце Саюза левых дэмакратаў.

На пленуме зноў была закранута справа ўласнасці Беларускага музея і асяродка беларускай культуры ў Гайнаўцы, якую суд прызнаў ГП БГКТ. Старшыня Беларускага таварыства Ян Сычэўскі паінфармаваў прысутных аб тым, што Таварыства музея і асяродка беларускай культуры ў Гайнаўцы звярнулася ў суд, каб той змяніў сваё рашэнне і прызнаў права ўласнасці Таварыству музея і асяродку беларускай культуры. У гэтай справе выступіў Віктар Бура з Гайнаўкі.

Апошнім пунктам парадку дня былі вольныя прапановы. З іх найважнейшай справай, якая хвалюе многіх, была інфармацыя аб тым, што прэзідэнт горада Беластока настойліва не дае дазволу на пабудову помніка праваслаўным ахвярам другой сусветнай вайны. Былы ваявода Марэк Стшалінскі ўжо чатыры разы адмяняў негатыўную пастанову горада адносна пабудовы ўспомненага помніка ў межах Свята-Духаўскай царквы ў Беластоку.

Ганаровым госцем пленума быў консул Генеральнага консульства РБ у Беластоку Вадзім Палякоў.

Міхась ХМЯЛЕЎСКІ

Але ўсё на свеце змяняецца і людзям часцяком не хапае часу каб наведаць кнігарню і правесці там можа не адну гадзіну, блукаючы ўздоўж стэлажоў з кнігамі. З беларускімі кнігамі яшчэ цяжэй...

http://knihi.net

Інтэрнэт-шопінг ці, кажучы зразумелымі словамі, набыццё тавараў праз заказанне ў Інтэрнэце, ужо даўно стала рэчаіснасцю. Праўда, такая сякая насцярожанасць да данага спосабу выбару пакупак пакуль жыве амаль у кожным з нас. Але, пагадзіцеся, нават тую рэч, якая падалася нам добрай, калі мы яе тысячу разоў перакруцілі ў руках, зусім не абавязкова застанецца такой у штодзённым карыстанні. Тое ж адносіцца і да кніг, хаця, канешне, разгарнуць ячшэ нікім не чытаныя старонкі, каб пазнаёміцца са зместам, значна прыемней, чым паглядзець на выяўленне выдання ў Інтэрнэце і прачытаць побач невялікую анатацыю. Але ўсё на свеце змяняецца і людзям часцяком не хапае часу каб наведаць кнігарню і правесці там можа не адну гадзіну, блукаючы ўздоўж стэлажоў з кнігамі. З беларускімі кнігамі яшчэ цяжэй. Далёка не кожная кнігарня не тое, што на Беласточчыне, але і ў Беларусі, можа пахваліцца той колькасцю найменняў беларускіх кніг, якія іншым разам прапануе адпаведны сайт у Інтэрнэце. Адным з такіх «адпаведных» ёсць бачына «Кнігі — поштай», што месціцца па адрасе http://knihi.net.

Галоўная старонка сайта выглядае даволі сціпла, але ў той жа час без якога-небудзь залішняга аздаблення. Як у сапраўднай кнігарні, дзе зусім недарэчнымі глядзеліся б кветкі на полках ці рыфлёнае шкло на шафах. У цёмна-бэзавым абрамленні «стэлажу» пасярэдзіне старонкі выйсці да рубрык, а таксама выявы некаторых тавараў, якія прапануюць «Кнігі — поштай». Дарэчы, тыя ж самыя выйсці да рубрык знаходзяцца і ў традыцыйнай для гэтага левай частцы галоўнай старонкі, праўда, без пазначэння колькасці тавараў у кожным з гэтых раздзелаў.

Уверсе, побач з назвай сайта, выйсці да такіх старонак як «Прайс-ліст», «Форум», «Дастаўка і аплата» — усе яны больш практычнага плана і таму засяроджваць на іх увагу не варта. Акрамя адной старонкі, якая называецца «Пра нас». Шчыра кажучы, больш кароткай самапрэзентацыі мне яшчэ не даводзілася бачыць. Распрацоўшчыкі і натхняльнікі сваіх Інтэрнэт-прадстаўніцтваў пішуць у даным выпадку альбо многа, альбо ўвогуле нічога. Стваральнікі «Кніг — поштай» распавядаюць аб сваім сайце так: «Мэтай нашае працы ёсць пашырэньне і разьвіцьцё беларускае культуры». Усё. Калі нешта незразумела — калі ласка, пытанні праз «Форум». Свайго роду вынаходніцтва цэлага Байнэту.

Але зазірнем у іншыя раздзелы. Іх даволі многа — 12. Колькасць для сярэдняй па памерах кнігарні. Ёсць тут такія раздзелы як «Гісторыя», «Рэлігія», «Навука», «Паэзія», «Проза», «Публіцыстыка» і «Часопісы». Гэта для аматараў чытання. Тыя, каго захапляе прагляд разнастайных фотаздымкаў, могуць зайсці на старонку «Фотаальбомы».

Прыемна, што не абышлі ўвагай віртуальныя кнігагандляры і дзіцячую аўдыторыю. На сайце маецца старонка «Дзеткам», адзінай заганай якой ёсць нешматлікасць прадстаўленага тавару.

Зразумела, «пашырэнне і развіццё беларускай культуры» продажам праз Інтэрнэт толькі кніг не абмяжоўваецца. Таму на сайце можна знайсці і прапановы па набыццю відэакасет і кампакт-дыскаў з музычнымі запісамі. Змест запісанага варты таго, каб у літаральным сэнсе вочы разбегліся ад прапаноў. Само па сабе гэта вельмі дарэчы, бо знайсці падобны тавар у адпаведных беларускіх крамах практычна немагчыма. Таксама як цалкам выключана знайсці на магазінных полках Беларусі настольны бел-чырвона-белы сцяжок, які прадстаўлены як на галоўнай старонцы, так і ў рубрыцы «Рознае».

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

У беларускага дзюдо свае пераможныя традыцыі. Вучэнне, распрацаванае японцам Дзігора Кано ў асобны від спорту, пачало актыўна развівацца ў Беларусі ў сярэдзіне 60-х гадоў мінулага стагоддзя...

Беларусь, беларусы...

Дзюдо для беларусаў не чужое

Паспяхова выступілі беларускія дзюдаісты на чэмпіянаце Еўропы, што прайшоў у фінскім Тампэрэ. У агульнакамандавым заліку нашы майстры „гнуткага шляху" (так адвольна можна перакласці слова „дзюдо") занялі высокае 7-е месца (гэта пры 38 краінах-удзельніцах). Перамаглі ж на першынстве кантынента французы.

У беларускага дзюдо свае пераможныя традыцыі. Вучэнне, распрацаванае японцам Дзігора Кано ў асобны від спорту, пачало актыўна развівацца ў Беларусі ў сярэдзіне 60-х гадоў мінулага стагоддзя, пасля таго як гэтую барацьбу ўвялі ў праграму такійскай алімпіяды. У дзюдо айчынныя атлеты ішлі пераважна з самба, якое, пры істотнай розніцы, найбольш блізкае з адзінаборстваў. Некаторыя і сёння паспяхова сумяшчаюць гэтыя два віды. Прыкладам Тацяна Масквіна. На гэтым першынстве яна, праўда, не выступала, бо неўзабаве збіраецца нарадзіць дзіця. А на рахунку Масквіной багата розных тытулаў у абодвух відах.

Пачынаючы з 2002 года беларускія прадстаўнікі пастаянна на п'едэстале буйных спаборніцтваў. З нашых дзюдаістаў першым значных поспехаў дасягнуў Віталь Песняк, які станавіўся трохразовым чэмпіёнам Еўропы (1983, 1984, 1985), двухразовым уладальнікам Кубка свету (1984, 1986), бронзавым прызёрам чэмпіянату свету (1985). Нямала медалёў прынёс для нашай краіны ўраджэнец азербайджанскага Баку Націк Багіраў, трывала асеўшы ў Беларусі. З жанчын варта ўспомніць Святлану Селіханаву, чатырохразовую чэмпіёнку старога свету (1992, 1993, 1995, 1996). На алімпійскіх гульнях у аўстралійскім Сіднеі (2000) бронзавы медаль заваяваў Анатоль Ларукоў, які прыехаў у Беларусь з Уладыкаўказа. А на апошняй алімпіядзе ў Афінах настаў зорны час Ігара Макарава, які здабыў вышэйшы тытул. Зараз на фінскім першынстве Макараў таксама выступаў, але стаў ахвярай неаб'ектыўнага арбітражу. Макарава відавочна засудзілі і ён заняў толькі 5-е месца.

Затое трыумфаваў Сяргей Шундзікаў, які выйграў залаты медаль. Гэта пакуль найвышэйшае дасягненне ў спартовай кар'еры ўраджэнца Новай Гуты. Да гэтага вышэйшым было камандавае другое месца на першынстве Еўропы 2002 года. У Тампэрэ Шундзікаў прадэманстраваў „вышэйшы пілатаж" у катэгорыі да 81 кг, у фінале адолеўшы самога алімпійскага чэмпіёна Джузэпэ Мадалоні з Італіі. Прычым перамог яго кідком на „іпон" (поўнае ачко і чыстая перамога адразу)!

З медалямі вяртаюцца дахаты таксама Святлана Цімашэнка (катэгорыя да 78 кг) і Юлія Барысік (звыш 78 кг). На чэмпіянаце Еўропы яны занялі трэція месцы. Мог выбіцца ў прызёры і гродзенец Канстанцін Сямёнаў (да 73 кг), які „па дарозе" адолеў чэмпіёна свету венгра Акаса Браўна, але ў выніку стаў толькі пятым. З іншых варта адзначыць яшчэ Марыну Жарскую (да 52 кг) — 7-е месца і Вольгу Лешчанка (яна замяніла Масквіну ў катэгорыі да 48 кг) — 9-е месца. У цэлым жа чэмпіянат паказаў, што дружына на чале з галоўным трэнерам Паўлам Ясяноўскім стаіць на правільным „гнуткім шляху".

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Вачамі праваабаронцы

Віктар заўсёды лічыў сябе беларускім нацыяналістам. Не тое, каб ён меў нейкія прэтэнзіі ці непавагу да іншых, гэтага не было, проста праблемы іншых яго мала хвалявалі. Любіў сваю нацыю. І ў палітыку папёрся, каб лепшае для свайго народу здабыць. Ну а іншыя, казаў, хай самі вырашаюць свае праблемы. Нам бы, маўляў, абы сваё разграбсці ўдалося.

Як беларускія палітычныя лідэры на мітынгах ці ў прэсе пачыналі хвалявацца за чачэнцаў ці яшчэ каго — вельмі злаваўся. Раіў не лезці ў чужую палітыку, як і ў чужыя кішэні. Хай самі разбіраюцца са сваім. І з якой пяшчотай заўсёды гаварыў пра беларусаў, так у дачыненні да іншых мог адкалоць і непрыстойны жарцік, кшталту таго, што ў нейкага там афрыканца шкура вельмі прыгожая. Маўляў, добрыя боты з яе могуць атрымацца. Чорныя, такія бліскучыя. Нават гуталіну не трэба. Анучкай пратрэш — і зноў блішчаць.

Яму нават спрабавалі даць мянушку „гамафоб". Ды не прыжылася, хіба таму, што нейкай там сапраўднай грэблівасці да іншых не было ўвогуле. Але факт застаецца фактам — як убачыць афрыканца, то ўсё пра тыя боты ці то жартуе, ці то марыць.

З афрыканцамі на перыферыі не так ужо і часта сустрэнешся. Але першая непасрэдна-блізкая сустрэча пакінула вельмі адмоўнае ўражанне. Віктараў сябра, пасля чарговага куфля піва, пайшоў у прыбіральню. А там нейкі, добра налізаўшыся гарэлкі, чарнаскуры пачаў рабіць яму недвухсэнсоўныя сексуальныя прапановы. Раз'юшанасць сяброў, якія ніколі не мелі талерантнага стаўлення да сексуальных меншасцей, магла закончыцца фатальна для афрыканскага госця. І той гэта зразумеў. Тым больш, што Віктар не стаў на гэты раз захапляцца мажлівасцю пашыць боты, бо гэта вельмі доўга. Проста ў рэзкіх фразах коратка растлумачыў няўдачліваму сексуальнаму агрэсару, што экзатычныя дзяжкі з яго плячэй разыдуцца на гродзенскім рынку па сто баксаў за кожную, нават без пражкі. Напалоханы такой перспектывай афрыканец стаў крычаць, што калі хлопцы яго будуць біць, то іх пакарае сам Бог. Гэта падзейнічала. Лавеласа проста выкінулі з бара, адчыніўшы дзверы ягонай галавой.

Другое блізкае знаёмства з цёмнаскурым было больш станоўчым. Неяк у Мінску быў мітынг апазіцыі за захаванне беларускай мовы. Міліцыя пахапала мітынгоўшчыкаў і стала пакаваць іх у машыны. Віктара таксама ўкінулі ў аўтазак, дзе ён з такімі ж як сам залізвалі раны па дарозе да пастарунка. Дзверы аўтазака час ад часу адчыняліся, каб закінуць туды чарговага апазіцыянера. І раптам, міліцыянты адчыняюць дзверы і штурхаюць у машыму чарнаскурага хлопца. Апазіцыянеры ў адзін голас закрычалі на міліцыянтаў: „Што вы робіце?! Зусім сумленне згубілі. Звяры! Нашто здзекуецеся з невінаватага? Няўжо не бачыце, што ён не наш!" Але якое было здзіўленне, калі чарнаскуры — замест пакарыстацца нагодай ды вызваліцца — пакрыўджана закрычаў на цудоўнай беларускай мове: „Ваш я, хлопцы, ваш. Не адракайцеся ад мяне. Я ваш!"

З тае пары Віктар перастаў жартаваць пра боты. Тым больш, што па волі лёсу стаў працаваць у адной праваабарончай арганізацыі, дзе патрабавалі дбаць пра правы ўсіх пакрыўджаных, а не толькі беларусаў. Ён так і рабіў, хоць да беларусаў ставіўся больш пяшчотна. Пакуль не патрапіў у сітуацыю поўнага абсурду.

Яго чарговы раз кінулі на нары, на так званыя суткі. Зноў дарогу ўладзе перайшоў. А ў камеры сядзіць нігерыец, ды такі чарнаскуры, што пакуль не засмяецца ў цемры, то не заўважыш што ёсць. Таксама сядзеў на сутках. Праўда, не за палітыку. Віктар спачатку на яго і ўвагі не звяртаў. Але калі маладога чарнаскурага хлопца кожны дзень, пачынаючы з самай раніцы, белыя міліцыянты прымушалі то падлогу мыць, то посуд, то дарожкі ад снегу чысціць — не вытрымаў.

— Як выйду адсюль, буду скардзіцца ў міжнародныя арганізацыі, — зароў ён, нібы ў камеру да яго падсялілі дваццаць сем чарцей і аніводнай вядзьмаркі. — Вы што робіце? Раба сабе набылі? Чаму іншых не прымушаеце працаваць, а толькі чорнага? Упісваеце ў беларускую гісторыю новую старонку чорнага рабства?

Міліцыянты напалохаліся і больш нігерыйца не чапалі. Самі падлогу мылі. А Віктар цэлымі днямі слухаў аповеды сукамерніка пра Нігерыю, Афрыку і думаў, ці ёсць там праваабаронцы, якія ў выпадку чаго змогуць абараніць правы пакрыўджанага нігерыйскімі ўладамі якога-небудзь беларуса.

Генрых ЗПАДАШМЯНСКІ

Вясновыя вандроўкі (3)

Заахвочаны прапановай Андрэя Смыка, падаюся ў бок сядзібы Міхала Леўчука, які з дзядзькам Росцікам чакалі мяне пры гарбаце. Гаспадар прывітаў на панадворку. Праз змрочныя сенцы праходзім на кухню. Сталовая, як і суседні пакой, акуратна задбаны. Усё на сваім месцы. Міхась на хуткую руку рыхтуе гарбату і сціплы пачастунак. З суседняга пакоя прыносіць папяровы пакет са здымкамі. Шмат фатаграфій, кожная з якіх мае сваю гісторыю. Міхась расказвае пра мінулае, школьныя гады ды аб сучасным жыцці „старога кавалера", як аднавяскоўцы звыклі называць халасцякоў сталага ўзросту. І так пачынаецца аповед.

— Бацька памёр на сорак сёмым годзе жыцця. Маці два гады таму. Пры немцах была яна вывезена на прымусовыя работы ва Усходнюю Прусію. Вось што захавалася з яе ўспамінаў:

„Забралі 5 траўня 1942 года. Зборны пункт назначылі ў Бельску-Падляшскім. Чыгуначным транспартам павезлі ў раён Кёнігсберга. Пачатковa назначылі ў маёнтак аднаго немца. Шмат вуллёў у яго было. Аказаўся ён няветлівым чалавекам. Аднойчы матулю гарачым воскам апарыў. Аб здарэнні даведаўся камендант горада Ландсберг (цяпер: Gorowo Iławieckie), які асабіста прыехаў у маёнтак праверыць справу. У той жа дзень забраў ён маці да сябе ў якасці апякункі дзяцей.

Новы гаспадар называўся Ато Даманоўскі, а гаспадыня — Эна. У іх было чацвёра дзетак. Запамятала толькі Юргена і Кэці. Гаспадары аказаліся ветлівымі людзьмі. Прызначылі маці асобнае памяшканне. Калі гаспадары прымалі гасцей, тады маці ела ў сваім пакоі, а так сталавалася разам з гаспадарамі.

Непадалёк Ландсберга ў маёнтку іншага немца працавала Тэрэза, палячка з-пад Нараўкі. Жанчыны па-

Міхал Леўчук

сябравалі. У свабодны час сустракаліся ў горадзе, шпацыравалі. У гаспадароў на стале стаяла сярэбраная шкатулка. Аднойчы маці пацікавілася яе змесцівам. Апрача ювелірных вырабаў прыкмеціла шэсць таблетак. Пані Эна сказала: «Не чапай, гэта атрута... цыяністы калій, на выпадак, калі б мы не паспелі ўцячы перад рускімі».

Калі фронт пачаў набліжацца, мясцовыя немцы пачалі падавацца ў глыб Трэцяга Рэйха. Было гэта напрадвесні. Віслінскі заліў быў яшчэ пад лёдам. Ехалі ўначы фурманкамі. У Кёнігсбергу чакала судно, на якое грузіліся ўцекачы".

— З Нямеччыны маці вярнулася пасля трохгадовага бадзяння па чужыне, — канчае аповед пра маці Міхась.

Гартаю старыя здымкі. На адной фатаграфіі ад 1934 года двух мужчын ва уніформах паліцыянтаў санацыйнай Польшчы.

— Гэта калегі майго бацькі, — тлумачыць Міхась Ляўчук. — Адзін з іх — Ваўранюк з Гаек. Ягоны сын зараз у Апацы жыве. А гэта Тэрэза з-пад Нараўкі, што разам у Нямеччыне была...

Гаспадар на момант выходзіць у суседні пакой і прыносіць шыкарна вытканы каляровы пояс.

— Памятка па цётцы засталася, — тлумачыць. — Поясу больш за сто пяцьдзесят гадоў будзе. Вось якую гісторыю матуля расказвала:

„Сцепаніда, сястра дзядулі Мірона Назарука ў Пачаеўскі манастыр паступіла. А закон у манастыры быў такі: кожная манашка перад пострыгам абавязана была выткаць пояс. Пасля ім карысталася ў святочныя дні. На поясе запісана малітва, якая абараняла людзей ад буры і агню. У час навальніцы запальвалі ў акне свечку ды гаварылі гэтую малітву. Казалі, што навальніца мінавала".

— Гэты пояс цётка Сцепаніда дала матулі, калі яе ў Нямеччыну забіралі. Як бачыце, — адзначае Міхась, — матуля шчасліва дамоў вярнулася. Цётка ў 1947 годзе памерла. У спадчыну пояс застаўся.

Так дакладнай работы дагэтуль я не бачыў. Кожна літара выразная, быццам намаляваная. Чытаю словы малітвы: „Живым вышним помощи кроме Бога небесного...". Пояс вытканы каляровымі ніткамі. Сапраўдны рарытэт для музея.

Пры гарбаце хутка мінае час. Міхась расказаў таксама пра сваё дзяцінства і школьныя гады.

— Навуку ў пачатковай школе пачынаў я ў Касьянавай хаце. Спачатку вучыла настаўніца Надзея Недзьведзь з Белавежы, затым Яўген Давідзюк, Надзея Філіманюк... Сямігодку закончыў я ў 1963 г., а дрэваапрацоўчы тэхнікум у Гайнаўцы ў 1968 г. Пасля тэхнікума праходзіў стажыроўку ў тартаку ў Нурцы. Прафесіянальную працу пачынаў у насычальні ў Чаромсе. Дзесяць гадоў перапрацаваў на Беластоцкім мэблевым камбінаце. Калі маці пачала дрэнна сябе адчуваць, вярнуўся дамоў. Зараз працую ў „Дрэвэкспалю" ў Кляшчэлях.

— Не сумна жыць адзінока? — пытаю прыяцеля.

— Прывык... Ды хто ў такім узросце захоча браць лішнія абавязкі? Была ў мяне дзяўчына, але не ажаніўся, а яна таксама замуж не выйшла. Відаць, доля такая, — з сумам гаворыць мой суразмоўца.

Канчаецца аповед калегі, шчырага прыяцеля, з якім неаднойчы грыбочкі збіралі. Дзядзька Росцік адно прыслухоўваўся размове. У яго таксама цікавая гісторыя. Але аб гэтым іншым разам.

Уладзімір СІДАРУК

У абароне святасцей

Хрысціянскае аб'яднанне „OIKOUMENE" ў РП у Беластоку ў красавіку г.г. наладзіла сустрэчу з паслом Сейма Яўгенам Чыквіным. На сустрэчы прадстаўлена было многа цікавых праблем, між інш. запісы Закону аб нацыянальных і этнічных меншасцях і аб рэгіянальных мовах, прынятай Сеймам РП у 2005 годзе. Старшыня Праўлення аб'яднання Аляксандра Навацкая падзякавала Я. Чыквіну за арганізацыйную працу над падрыхтоўкай надта цікавай і карыснай выставы „Хрысціянская спадчына Косава — супольная адказнасць", якая са згоды маршала Сейма Марка Юрка дэманстравалася таксама ў днях 22-25 сакавіка г.г. у сеймавым будынку ў Варшаве. Выстава выклікала вялікае зацікаўленне наведвальнікаў, асабліва паслоў Сейма і сана-тараў. Гэтая выстава паказала, што на вачах усяго свету маглі здзяйсняцца такія варварскія акты не толькі ў дачыненні да грамадства, але таксама і ў адносінах да шматвя-

Злева: Галіна Грык — намеснік стыршыні аб'яднання, Аляксандра Навацкая — старшыня, Тамаш Глянц — генеральны дырэктар Кабінета маршала Сейма РП, Барбава Рошка — сакратар аб'яднання.

ковых культурных дасягненняў, у першую чаргу помнікаў сакральнага характару. Выстава дала пасведчанне неабвяргальнага права чалавека да міру і да захавання нашчадкам твораў яго рук.

Прыемна нам, членам аб'яднання, што маршал Сейма аказаўся чалавекам адкрытым і неабыякавым на лёс разбураных ваеннымі дзеяннямі старадаўніх сакральных помнікаў. Праўленне аб'яднання скіравала маршалу Сейма ліст са словамі прызнання і сардэчнай падзякі за згоду на лакалізацыю выставы ў будынку Сейма. У выніку карэспандэнцыі Тамаш Глянц, генеральны дырэктар Кабінета маршала Сейма, запрасіў праўленне нашага аб'яднання нанесці візіт у Сейм, з магчымым праектам супрацоўніцтва. Сустрэча адбылася 26 красавіка г.г. Наша аб'яднанне атрымала згоду на правядзенне ў будынку Сейма навуковай канферэнцыі і экспазіцыю выставы „Агія Сафія — жамчужына хрысціянскага мастацтва". Актуальна вядзем карэспандэнцыю з Экуменічным Патрыярхатам у Стамбуле ў справе атрымання гістарычных матэрыялаў, якія датычаць храма Агія Сафія.

Віктар ШВЕД

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Nakład: 1 350 egz.
Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*

Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.
Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Сакратар рэд.: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран-Асташэвіч.

Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na III kwartał 2006 r. upływa 5 czerwca 2006 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.

2. Cena prenumeraty na III kwartał 2006 r. wynosi 26,00 zł.

3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.

4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,50 zł, a kwartalnie — 45,50 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą: kraje europejskie — 5,00 (kwart. — 65,00), kraje pozaeuropejskie — 5,20 (kwar. — 67,60). Pocztą priorytetową: kraje europejskie — 6,00 (kwart. 78,00), Ameryka Półn., Afryka — 6,70 (kwart. — 87,10), Ameryka Połud. i Środ., Azja — 7,80 (kwart. — 101,40), Australia — 10,00 (kwart. — 130,00). Wpłaty: Rada Programowa Tygodnika „Niwa", BPH PBK SA O/Białystok 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.

Дзяўчо

Бася, кончыўшы гімназію ў мястэчку, пайшла ў тэхнікум у Беласток. Магла, праўда, выбраць найлепшы ліцэй, ды пераканала яе тое, што і так вырвецца ад бацькоў, будзе жыць, праўда, у інтэрнаце, бо танней чым наняць кватэру, і харчаванне гарантуецца. Бацькам таксама выгада — дзіця пад апекай выхаваўцаў будзе.

Спачатку дзяўчына прыязджала дадому кожны тыдзень, пасля, калі пахаладала, заглядала да яе маці. Бася не была супраць перадач з хаты, але прасіла грошай. — Нашто табе грошы? — дзівілася маці. — Усё заплачана, усё пададуць, адзетая так як лялька... Як што новае хочаш, давай паедзем на базар... — Хопіць мне апранацца на базары! Пралятаюць тыя шматкі! Не хачу такога, бо выглядаю як нейкая саветка, што абкупілася на Кавалерыйскай! Хутчэй грошы совала Басі бабуля. Сварак з-за гэтага не было — не хочаш, не будзе, захочаш сама заробіш, і будзеш апранацца як табе там трэба. Не будзе работы ў Польшчы — з прафесіяй знойдзеш яе на Захадзе. Адно вучыцца трэба, бо без навукі няма жыцця. Ды Басі, мабыць, не вельмі ішло ў школе. Прыехала маці на класны сход, і начулася! Што і вучыцца Басі не ў смак, і з дзяўчатамі ў інтэрнаце б'ецца. Ездзіць дадому штотыдзень, дык бацькі павінны з ёю паразмаўляць.

Бася растлумачыла маці, што на суботы ды нядзелі найчасцей едзе да сяброўкі, там і начуе. Ірэна жыве са старэйшай сястрою, якая зарабляе. Бацькі дзяўчат працуюць за мяжой, прысылаюць грошы. Басіна маці бачыла тую Ірэну ў школе. Здалася ёй дзяўчынай талковай, культурнай.

Калі сталі шукаць Басю і школа, і бацькі, перш за ўсё паехалі на кватэру да Ірэны і Ганны. І яны не ведалі, дзе прапала дзяўчына. Казалі, праўда, прыехала да іх была пабітая, у парваным адзеннні. У інтэрнат не хацела вяртацца, мабыць, пабілася з каляжанкамі. Усё Басю кацапкай празывалі, дык даставалі за тое. Мела з сабою школьны рукзак, з кніжкамі ды адзеннем.

Дзяўчына прапала, бы ў ваду канула. Не памагалі пошукі паліцыі. Маці меркавала, што гэта нагаварыла суседка, зачаравала. Усё чалавеку надумаецца! Бабуля ўрэшце сабралася ды паехала ў Члухаў, да празорліўца. Адстаяўшы ў яго чаргу (звярталіся да яго нават паліцыянты ў цяжкіх справах), бабуля даведалася, дзе шукаць прапаўшую ўнучку. Па-першае — у Беластоку, у невялікім доме недалёка сажалак, дзе зялёныя ўваходныя дзверы, а калі не будзе яе там, дык, дакладна, у... Слупску.

На паліцыі ўжо бралі старую на смешкі, але, пачуўшы прозвішча члухаўскага празорліўца, паехалі шукаць згаданага дому. Неўзабаве дакладвалі ў камендатуру: жыхар кватэры ўцёк, пакінуўшы шаснаццаць маладзёжных рукзакоў з кніжкамі і дзявочым адзеннем.

Басю знайшлі сапраўды ў Слупску. Жыла там на кватэры з трыццацігадовым мужчынам. Прызналася, што яе прабавалі вывезці за мяжу, у нейкі клуб на працу, ды на мяжы пагранічнікі распазналі фальшывы пашпарт, звярнулі ўвагу на неспакойнае дзеўчаня з дзіцячым тварыкам. А цяпер, вось, жыве яна са сваім чалавекам. І нікому нічога да гэтага. У школу хадзіць не мусіць, усё мае што трэба. **(лук)**



Усходняя сцяна

Часта я пісаў у „Ніве"
Пра Усходнюю сцяну:
Як тут вёскі адміраюць
І як людзі ў іх жывуць.

Крамы тут ліквідаваны,
Што пры камуне расцвілі.
Чыгункі ўсе пазакрывалі,
Пэкаэсы — аднялі.

А прыедзе крама ў вёску,
Прывязе ліхі тавар,
Прадавец здзірае грошы,
А ты, хлопе, мусіш браць.

Калі ты не купіш у краме
Ніц не ўложыш у гаршчок
І аб гэтым добра знаеш —
Што не паедзеш у Гарадок.

У гарадах ляпей жывецца,
Там тэатр, крамы, кіно,
Кожны ў горад з вёскі пхнецца,
Бо там — лягчэйшае жыццё.

Калі нашы самаўрады
Пра людзей так будуць дбаць,
Хутка на Сцяне ўсходняй
Будуць малпаў гадаваць.

Пра нішто яны не дбаюць,
Каб лягчэй жылося нам.
Сабе кішэні „набіваюць"
Трэба нам аб гэтым знаць.

Не прыедзе ўлада ў вёску,
Каб пабачыць чым жыве,
Склікаць сход, пагаварыці,
Што патрэбна для яе.

Крэслы ім так дарагія —
На ім мяккенька сядзець.
А што робіцца за гмінай —
Ім не хочацца глядзець!

Мікалай ЛУК'ЯНЮК

Адгаданка



1. сістэма спартыўнага спаборніцтва каманд парытэтных па майстэрству , 2. жывот з... лічэбнікам, 3. стойка з кручкамі, на якую вешаюць адзенне, 4. прылада для пісьма з аўтаматычнай падачай чарніла, 5. пацешная назва носа, 6. не верх.

(Ш)

Адгаданыя словы запісаць у вызначаныя дарожкі, пачынаючы ад поля з лічбай. У светлых палях атрымаецца рашэнне — фразеалагічны тэрмін.

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 18 нумара

Карэта, струк, Рыбы, партыя, Каліш, Ной, Вадалей.

Рашэнне: **Сакрэт палішынеля.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем: **Анатолу Маўчану** з Познаня, **Міхалу Байко** з Беластока.

11.06 – 17.06

Баран (21.03. — 19.04.) Поўня Месяца ў Стральцы (11.06.) — ідэальны час на рашэннні аб далейшай адукацыі. З 16.06. лёгка цябе вывесці з раўнавагі; пазбягай дыскусіі з шэфам. З 17.06. (да 21.06) можаш панесці відную паразу. Не будзь залішне самаўпэўненым і не абяцай залатых гор нікому. Карысныя інвестыцыі, шчасце ў латарэі (увесь, дарэчы, месяц).

Бык (20.04. — 20.05.) Да 13.06. магчымыя любоўныя сустрэчы з былымі каханымі. Не ідзі залішне за голасам сэрца, бо можаш неадпаведна памясціць свае пачуцці. Цяжкаватая атмасфера дома.

Блізняты (21.05. — 21.06.) Можаш разлічваць на добрыя лады з шэфам, знакамітыя ідэі, вынікі ў навуцы, поспехі ў інтарэсах. У пары пробы сіл, змаганне замест падтрымкі.

Рак (22.06. — 22.07.) Пільнуй свайго здароўя. Старайся не стрэсавацца. 10-14.06. не папракай партнёра ў яго слабасцях, бо гэта не пойдзе ў дабро вам абоім. Вялікая падтрымка сяброў, хоць шэф можа ўздумаць зрабіць з цябе казла адпушчэння.

Леў (23.07. — 22.08.) Добры час на падарожжы, экзамены, негацыяцыі. 14-17.06. ахвота націскаць на іншых, жорсткасць, дыктатарскія схільнасці. Добрыя адносіны ў сужонстве, ды калі схочаш ашукаць сваю палавінку, звесціся не дасца.

Дзева (23.08. — 22.09.) Да 14.06. наладзіш найцікавейшыя знаёмствы. Інтуіцыя цябе не падвядзе. Калі моцна папсаваныя адносіны ў пары, магчымае расстанне. У фірме пакажаш сваю кампетэнтнасць, інтэлігентасць, кемлівасць.

Шалі (23.09. — 22.10.) Да 13.06. можа цябе захапіць каханне з першага пагляду. 13-17.06. ты пад уплывам квадратуры Нептуна з Венерай — будзеш няўпэўнены, небаявіты. Твая лёгкадумнасць можа стаць тваёй згубай!

Скарпіён (23.10. — 21.11.) Час спрыяльны для інтэлектуальнай працы і працяглага разумовага высілку. Можаш здзейсніць дальнабачныя планы. 14-17.06. расколы, канфлікты, непаразуменні, горшае здароўе і праблемы ў фінансах.

Стралец (22.11. — 21.12.) Шмат рэчаў высветліцца з карысцю для цябе. Многа энергіі і запалу. Некаторыя справы, аднак, паставіш рубам.

Казярог (22.12. — 19.01.) Знакаміты кантакт з усімі. З 16.06. прабудзяцца ў табе таленты, будзеш энергічны, сарганізаваны, здольны без аглядкі змагацца за сваё. Але і шмат цяжкай ды ўтомнай працы.

Вадалей (20.01. — 18.02.) У фінансах найгоршае за табою, але не бяры крэдытаў!!! Да 14.06. расслабішся, будзеш свабодны і спантанны. 10-14.06. апынешся на адпаведным месцы і ў адпаведны час ды дастанеш тое, на чым табе найбольш залежыць.

Рыбы (19.02. — 20.03.) Не вер у абяцанні партнёра і глядзі праз пальцы на тое, што гавораць знаёмыя. Дома ўсё дзейнічае без заган, але лепш гэта ты трымай руль у сваіх руках.

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960